# УПЭЎНЕНЫ КРОК НЕЗАЛЕЖНАЙ БЕЛАРУСІ

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

3 ЛІПЕНЯ 2010 г. СУБОТА № 128 (26736)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.





## Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас з Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь — галоўным дзяржаўным святам, якое адлюстроўвае адзінства і духоўную стойкасць нацыі.

Глыбока сімвалічна, што яго дату вызначылі вы самі на рэспубліканскім рэферэндуме, звязаўшы яе разам з днём вызвалення Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Краіна талентаў і патрыётаў — вось што такое Беларусь.

У ёй няма і не будзе месца забыццю народнага подзвігу. У год 65-годдзя Вялікай Перамогі мы яшчэ раз аддаём даніну павагі бяспрыкладнаму гераізму людзей, якія выратавалі планету ад фашызму.

За час міру і стварэння мы разам ператварылі параненую беларускую зямлю ў квітнеючыя палі і сады, сучасныя прамысловыя цэнтры і аграгарадкі. Такое пад сілу толькі працавітаму, высокаінтэлектуальнаму народу.

Незалежнасць і суверэнітэт краіны, мудрасць і бясцэнны вопыт ветэранаў сёння ў руках маладога пакалення. З такой моладдзю Беларусь чакае годная будучыня. Ніякія крызісы не спалохаюць дзяцей і ўнукаў Пераможцаў.

Шчыра зычу вам, дарагія сябры, моцнага здароўя, міру, дабрабыту, спакою і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні.

Са святам! З Днём Рэспублікі!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Мінск. Ветэран спяшаецца на свята на праспект Пераможцаў.**

## НЯЗГАСНАЯ ЛАМПАДА Ў КРЫПЦЕ ХРАМА-ПОМНІКА

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора прыняў удзел у цырымоніі пахавання астанкаў невядомых салдатаў у крыпце Храма-помніка ў гонар Усіх Святых у Мінску, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Гэта ўрачыстае мерапрыемства, якое мае важнае духоўна-гістарычнае, грамадзянскае і культурнае значэнне, сабрала тысячы мінчан і гасцей сталіцы. Цырымонія трансліравалася ў прамым эфіры Першага нацыянальнага тэлеканала. У нішах сцяны крыпты (ніжняя алтарная частка храма) пахаваны астанкі воінаў, знойдзеныя спецпадраздзяленнем Міністэрства абароны ў час пошукавых экспедыцый. Гэта астанкі невядомага ўдзельніка Айчыннай вайны 1812 года, які загінуў у баях з французскімі войскамі пад камандаваннем Мюрата; астанкі салдата Першай сусветнай вайны, які загінуў у жніўні 1915 года пад Гроднам пры стрымліванні наступлення кайзераўскіх войскаў; а таксама астанкі невядомага байца Вялікай Айчыннай вайны, паўшага ў лістападзе 1943 года пасля фарсіравання Дняпра пад Лоевам.

Храм-помнік у гонар Усіх Святых мае форму шатра, увенчанага крыжам. У аснове будовы шатра ляжыць лік дзевяць, ён утвараецца васьмю шырокімі гранямі з геаметрычным цэнтрам — яго вяршыняй. Лік дзевяць у хрысціянскай традыцыі азначае дзевяць чыноў ангелаў і святых.

У крыпце будзе сабрана зямля з месцаў усіх вялікіх гістарычных бітваў у абарону Айчыны. Тут прадугледжваецца перапахаванне астанкаў вядомых гістарычных дзеячаў, устаноўка мемарыяльных дошак па ўсім перыметры, упляценне ў арнамент пласцін з імёнамі загінуўшых. У крыпце Храма-помніка запалена нязгасная лампада.

Узвядзенне Храма-помніка сімвалізуе ўдзячнасць і вечную памяць многім пакаленням беларусаў, якія аддалі сваё жыццё за Радзіму.

## «Белтрансгаз» і «Газпрам» падпісалі дадатковае пагадненне да кантракта па транзіту газу

Аб гэтым карэспандэнту **БЕЛТА** паведаміў генеральны дырэктар ААТ «Белтрансгаз» Уладзімір Маёраў. «Бакамі падпісаны неабходныя дакументы, у якіх устаноўлена стаўка па транзіту на 2010 год у памеры $1,88 за 1 тыс. куб. м на 100 км. Цяпер бакі праводзяць канчатковую зверку разлікаў», — сказаў Уладзімір Маёраў.

## ГАЛА-КАНЦЭРТ АКЦЫІ «БЕЛАРУСЬ — ГЭТА МЫ» ЗБЯРЭ БОЛЬШ ЗА 40 АРТЫСТАЎ

**Беларускія і расійскія зоркі эстрады выступяць сёння ўвечары ля стэлы «Мінск — горад-герой». Паводле папярэдняй інфармацыі, чакаецца, што адкрыюць святочны канцэрт вядучыя Саша Паўлава і Іван Вабішчэвіч. Цэнтральную і асноўную частку канцэрта правядуць Вольга Багатырэвіч і Аляксандр Аверкаў. Затым іх зменяць Наталля Немагай (замест Людмілы Якімовіч) і Яўген Булка, апошняй парай вядучых стануць салісты гурта «3+2» Арцём Міхаленка і Алена Карповіч.**

Адным з арганізацыйных момантаў канцэрта стане ўдзел прадстаўнікоў БРСМ і ўдзельнікаў танцавальных клубаў, якія будуць падтрымліваць выступленні сінхроннымі рытмічнымі рухамі ў такт музыцы.

Шоу пройдзе пад дэвізам «Беларусь — гэта мы». Як расказаў «Звяздзе» **народны артыст Беларусі Аляксандр ЦІХАНОВІЧ,** які ўжо выступаў у рамках гэтай акцыі з сольным канцэртам у Кобрыне, самае важнае падчас такіх акцый — гэта еднасць з гледачамі:

— Самае галоўнае — людзі...

**Ілья ЛАПАТО.**

## «БЮДЖЭТНЫ» РАЗРАД — З КАРЭКЦІРОЎКАЙ

**Міністэрства працы і сацыяльнай абароны сваёй пастановай № 82 ад 22 чэрвеня гэтага года зацвердзіла карэктуючыя каэфіцыенты да тарыфных ставак (акладаў) работнікаў бюджэтных арганізацый і арганізацый, якія атрымліваюць субсідыі. Варта нагадаць, што апошняе павелічэнне «бюджэтнай» тарыфнай стаўкі I разраду было зроблена з 1 чэрвеня, і з гэтага ж дня пачынаюць дзейнічаць карэктуючыя каэфіцыенты.**

У прыватнасці, як паведаміла **прэс-сакратар міністэрства Варвара АЛЕКСАНДРОВІЧ,** для работнікаў з 1 па 2 разрад каэфіцыент складае 2,616, з 2 па 3 разрад — 2,290, з 3 па 4 разрад — 1,975, з 4 па 5 разрад — 1,714, з 5 па 6 разрад — 1,587, з 6 па 7 разрад — 1,465, з 7 па 8 разрад — 1,389, з 8 па 9 разрад — 1,327, з 9 па 10 разрад — 1,288, з 10 па 11 разрад — 1,232, з 11 па 12 разрад — 1,165, з 12 па 13 разрад — 1,122, з 13 па 14 разрад — 1,077, з 14 па 15 разрад — 1,032, з 15 па 16 разрад — 1,025, з 16 па 17 разрад — 1,015, з 17 па 18 разрад — 1,010, з 18 па 19 разрад — 1,000, з 19 па 20 разрад — 0,996, з 20 па 21 разрад — 0,991, з 21 па 22 разрад — 0,987, з 22 па 23 разрад — 0,985, з 23 па 24 разрад — 0,983, з 24 па 25 разрад — 0,981, з 25 па 26 разрад — 0,980, з 26 па 27 разрад — 0,979 і па 27 разрадзе — 0,978.

**Сяргей ГРЫБ.**

НУ І НУ!

## МЕХАНІЗАТАРУ РУХАВІК... АДАРВАЎ ВУХА

**Падчас запуску рухавіка трактара «Беларус» механізатару адарвала вуха. Незвычайнае здарэнне адбылося на тэрыторыі механізаваных майстэрняў у гаспадарцы ў Пастаўскім раёне.**

48-гадовага механізатара адвезлі на «хуткай» з майстэрняў і шпіталізавалі ў мясцовую бальніцу. Ён таксама атрымаў пералом чэрапа... Адразу прызнаўся, што нікога не вінаваціць, бо сам выпадкова параніўся.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Мірныя Валаўскія ДАКі



ВАКОЛ паўднёвай беларускай вёскі Валаўск знаходзяцца 12 ДАКаў (доўгатэрміновых агнявых кропак), вонкава добра захаваных. Сваю ваенную абарончую функцыю гэтыя жалезабетонныя ўмацаванні не выконваюць ад самай вайны, і дакладна невядома, як выконвалі яе наогул. Сказаць, што яны засталіся на сметніку гісторыі нельга ўжо таму, што яны проста засталіся. Бо былі зробленыя па ўсіх правілах ваеннай інжынернай навукі. Да таго ж многія падобныя збудаванні былі ўзарваныя ў вайну ці разбітыя і знішчаныя пасля яе. Сваім суровым выглядам ДАКі нараджаюць думкі, што яны — непасрэдныя ўдзельнікі ваенных падзей. На выпадак вайны яны і ўзводзіліся. Дзе — незадоўга перад яе пачаткам, недзе — за дзясятак гадоў. Але гэтыя пачуцці ўзнікаюць у тых, хто набліжаецца да таямнічага збудавання ўпершыню. Жыхароў Валаўска гэтым ні здзівіць, ні напалохаць.

СТАР. 3

## «ВЫБІРАЙ, БАЦЬКА, ХТО БУДЗЕ ВАЯВАЦЬ...»

Аляксей КАРАЛЁЎ,
ветэран працы, інвалід другой групы, г. Гомель

### «Вайна будзе доўгай, Ваня...»

Жудасным, ваенным ліхалеццем апалена маё дзяцінства. Усё часцей звяртаюся да гісторыі сваёй сям'і, да перажытага ёй у Вялікую Айчынную.

Ужо на другі дзень вайны на прызыўны пункт я праводзіў 45-гадовага бацьку і старэйшага брата Івана, выпускніка сярэдняй школы, камсамольца. Наша мама памерла ў сакавіку 1941 года, і з бацькам засталося двое дарослых і трое малалетніх дзяцей. Таму ў дзейную армію павінен ісці хтосьці адзін з сям'і. Брат даказваў, што ён малады, здаровы мужчына прынясе больш карысці арміі. Бацька, умудроны жыццёвай практыкай, прайшоўшы праз Першую сусветную вайну, пабачыўшы яе нягоды, лічыў, што ён будзе больш патрэбным...

Спрабуючы ўразуміць майго разгарачанага брата, ён казаў: «Не хвалюйся, Ваня, вайна будзе доўгай — немцы добра падрыхтаваныя да яе, валодаюць вялізнай сілай, але хоць фашысты палову Еўропы і захапілі, бліцкрыгу ў Гітлера не атрымаецца. А таму і на тваю долю хопіць вайны, і я ўпэўнены, ты будзеш годным воінам».

Памятаю, у пакой прызыўнога пункта ўвайшлі ўсе ўтрох. Ваенком звярнуўся да бацькі: «Рыгор Хрысанавіч, мы можам прызваць у армію толькі аднаго з вас. Выбірай, бацька, хто будзе ваяваць...»

СТАР. 3

## Транспарт у святочную ноч працуе да 3.30

У ноч з 3 на 4 ліпеня, каб забяспечыць транспартнае абслугоўванне святочных мерапрыемстваў, прысвечаных Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, праца метрапалітэна будзе арганізаваная да 3.30. Да гэтага ж часу будзе падоўжана і праца камунальнага пасажырскага транспарту.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## МУЗЫЧНАЯ ВІЗІТОЎКА ПАСТАЎ

**У старажытных Паставах 2—4 ліпеня праходзіць дваццаты міжнародны фестываль «Звіняць цымбалы і гармонік».**

— Паставы — месца правядзення гэтага фестывалю, які стаў візітнай карткай горада. — расказвае «Звяздзе» старшыня Пастаўскага раённага выканаўчага камітэта Віктар Гутараў. — Жыхарам края вельмі падабаецца гэтае сапраўды народнае свята музыкі і песні. Заўсёды шмат гледачоў на традыцыйным конкурсе калектываў і выканаўцаў на народных інструментах «Хто каго?, у «Горадзе майстроў», на іншых акцыях фестывалю.

У рамках свята прайшоў першы конкурс прыгажосці, ён адбыўся ўчора. Ах, як шмат у краі прыгажунь! І іх прыгажосць ацанілі на музычна-тэатралізаваным паказе «Пастаўскі баль». У райвыканкаме размясцілі выставу, прысвечаную юбілею свята. Дарэчы, пастаўскую прапіску ён атрымаў не адразу. Праходзіў і ў Віцебску, Магілёве, а 17 гадоў таму «пасяліўся» ў Пастаўскім раёне. Улічваючы тое, што тут даражаць фестывалем, наўрад ці ён яшчэ куды-небудзь пераедзе. Сёлета вельмі шырокая геаграфія гасцей фестывалю. Сваё жаданне прадэманстраваць свае таленты, акрамя беларусаў, пажадалі артысты з Украіны, Літвы, Латвіі, Польшчы, Расіі.

Вельмі добра, што сёння, у Дзень Незалежнасці, творчыя калектывы выступаюць і перад жыхарамі вёсак — на сцэнічных пляцоўках раёна.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## АГУРКОВЫ РАЙ

Гаспадары

*Як адна беларуская вёска корміць мільёны людзей дома і за мяжой*



**КАЛІ ёсць на зямлі такое месца, дык гэта адназначна — беларуская вёска Альшаны, пра якую ведаюць у Расіі, колішніх эсэсэраўскіх паўднёвых рэспубліках, нават у Злучаных Штатах Амерыкі, дзе жыве шмат учарашніх альшанцаў.**

Найперш і найлепш пра гэты рай сведчыць агурковы кірмаш — агароджаны пляц на ўсходняй ускраіне Альшан. Не ведаю, ці існуюць у свеце агурковыя кірмашы наогул, якія можна было б параўноўваць паміж сабою ці з нечым іншым, да альшанскага просяцца параўнанні найвышэйшай ступені — самы буйны, самы шматлюдны, самы агурковы, самы грашовы, адным словам самы-самы! Па словах мясцовых фермераў, штодня з гэтага пункта ў самай што ні ёсць палескай глыбінцы на кірмашы Беларусі і асабліва Расіі вывозіцца ад адной да паўтары тысячы тон свежых цяплічных агуркоў. Калі прыкінуць месячны альшанскі агурковы зварот, лічба атрымліваецца неверагодная, амаль фантастычная. А агуркі ў Альшанах растуць з вясны па восень, і не толькі ў Альшанах — эканамічнамічны цуд адваёўвае ўсё большую прастору ў запрыпяцкай зоне, і ледзь мінаеш старажытны Тураў, як трапляеш у свет парнікоў і бясконцых агародаў. Малюнак краявідаў з парнікамі цягнецца да самага Століна.

СТАР. 6



## «ГЭТЫ ДЗЕНЬ — ГАЛОЎНАЕ СВЯТА КРАІНЫ»

А на мой погляд...

**Сёння ў краіне адзначаецца Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Што ён сімвалізуе для нашых чытачоў, якія асацыяцыі абуджае ў прадстаўнікоў розных пакаленняў? Як нашы рэспандэнты будуць яго адзначаць?**

***Пётр НАВУМЕНКАЎ, пенсіянер, г. Мінск:***

— Для мяне гэты дзень, як і для ўсіх іншых грамадзян краіны, сапраўднае свята. Упершыню я з'явіўся ў Мінску ў кастрычніку 1944 года. Мы пераехалі са Смаленскай вобласці, дзе ішлі жорсткія баі, дзе мы жылі ў зямлянцы... Дагэтуль памятаю той стары будынак чыгуначнага вакзала, лічаныя ацалелыя дамы на цэнтральнай вуліцы, па якой хадзіў трамвай, і руіны навокал... У першыя пасляваенныя гады былі халодныя зімы, а адзенне слабое, у трамваі ногі літаральна прымярзалі да металу. Што яшчэ памятаю? Карткі на прадукты. Як з сястрой стаялі ў чарзе за імі ў невялічкую краму на тагачаснай Грушаўскай вуліцы. Унутры маглі размясціцца не болей за дзесяць чалавек, астатнія мерзлі на вуліцы. Памятаю першы бохан хлеба, набыты пасля адмены картак. Гэта была вялікая радасць! Памятаю, як нёс пад пахай той бохан дадому. Так, было цяжка. Але быў і пад'ём! Кожны ў меру сілаў удзельнічаў у аднаўленні горада. Мы школьнікамі таксама, памятаю, грузілі бітую цэглу. І з кожным годам усё мянялася.

Я ўдзячны Беларусі, якая стала для мяне другім домам. І да Дня Незалежнасці стаўлюся з вялікай павагай. Гэты дзень прынёс і Перамогу і ў літаральным сэнсе — новае жыццё.

***Аляксандр ЛАСТОЎСКІ, начальнік прэс-службы ГУУС Мінгарвыканкама:***

— Гэты дзень — галоўнае свята краіны. Яно дазваляе вызначыцца: грамадзянін, патрыёт ты сваёй краіны або не. Такі своеасаблівы Рубікон. У мяне ў гэты дзень толькі станоўчыя эмоцыі, нават трава падаецца больш зялёнай (смяецца). Гэта я гавару абсалютна без пафасу, гэта маё сапраўднае стаўленне да Дня Незалежнасці. Як я яго адзначу? З аднаго боку, я не задзейнічаны ў ахове правапарадку, мне далі магчымасць адпачыць. Але па сваёй уласнай ініцыятыве я буду знаходзіцца на працы да канца ўсіх мерапрыемстваў — для зручнасці журналістаў. Для іх я буду заўсёды на сувязі. Так, гэты дзень мне не аплацяць, так, потым давядзецца адсыпацца, але гэтае свята ні з чым нельга параўноўваць.

***Надзея ГАЦУРА, пенсіянерка, вёска Панямонь Навагрудскага раёна:***

— Для людзей у нашай вёсцы гэты дзень найперш атаясамліваецца з заканчэннем вайны. Гэта галоўнае. За некалькі дзён да вызвалення многіх пагналі расстрэльваць, ужо і ямы падрыхтавалі. Была сярод тых людзей і сям'я майго мужа. Толькі цудам усе засталіся жывымі. Раней, калі былі маладзейшымі, многія вяскоўцы адзначалі гэты дзень разам. Цяпер ужо і ўзрост, і здароўе не тыя, але пра тыя падзеі памятаем. І за свята ўздымем па чарцы.

***Аляксандр МАРЦУЛЬ, вёска Рэзы Шчучынскага раёна:***

— Асабіста для мяне гэтае свята мае сувязь з вайной. І карані цяперашняй незалежнасці, пра якую мы гаворым, якраз бяруць пачатак ад той Перамогі. У Дзень Незалежнасці ў нашым райцэнтры пройдуць святочныя мерапрыемствы. Асабіста я буду браць удзел у шахматным турніры.

***Ніна ЧОРНАЯ, бібліятэкар, пасёлак Новапалескі Салігорскага раёна:***

— Што для мяне сімвалізуе гэта свята? Тое, што мы жывём у свабоднай, дэмакратычнай краіне. Прынамсі, мы кожны месяц атрымліваем зарплату, нашы дзеці маюць права выбару — атрымліваць бясплатную ці платную адукацыю. Вось такія выключна мірныя асацыяцыі ў мяне з Днём Незалежнасці. Я сама культработнік, таму прыму ў святочных мерапрыемствах самы непасрэдны ўдзел — буду весці ў нашым пасёлку тэматычную праграму перад канцэртам.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**


АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

КУП «Минский областной центр учета недвижимости».

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ МИНСКОГО ОБЛАСТНОГО СОЮЗА ПОТРЕБИТЕЛЬСКИХ ОБЩЕСТВ (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже единым лотом объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 11а, в составе:

**административно-хозяйственное здание** (инв. № 500/С-40517), об. пл. 117,2 кв.м, **здание складов** (инв. № 500/С-40518), об. пл. 666,9 кв.м. Начальная цена с НДС (снижена на 10 %) – 1 620 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,4111 га. Задаток – 100 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 25.05.2010. Аукцион состоится **13.07.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.07.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.


ISSN 1990 - 763X

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.07.2010 г. (для б/н разлікаў)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 3 015,00 | 1 чэшская крона | 146,53 |
| ▲ 1 еўра | 3 773,88 | 1 польскі злоты | 908,65 |
| 1 латвійскі лат | 5 312,31 | ▲ 1 расійскі рубель | 96,65 |
| 1 літоўскі літ | 1 091,26 | 1 украінская грыўня | 380,92 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 31,1942 |
| 10 UAH | 39,4115 |
| 1000 BYR | 10,3155 |
| EUR | 38,9928 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

# СВЯТА: МІНСК ВІТАЕ

**ВЫЗВАЛЕННЕ**

сталіцы ад фашыстаў узгадаюць ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Сёння — найперш іх свята. Яны пройдуць разам па праспекце Незалежнасці да помніка Перамогі, каб ускласці вянкі ў памяць пра тых, хто загінуў. Іх можна прывітаць і асабіста далучыцца да святкавання ўжо а 12-й гадзіне дня.

У кожным з раёнаў горада ў гэты дзень будуць вітаць і віншаваць ветэранаў, а таксама тых жыхароў сталіцы, якім надалі званне «Мінчанін года».

**СПАЛУЧЭННЕ**

дасведчанасці, вопыту і розуму ветэранаў з імпэтам маладых можна будзе назіраць ля ўсіх пляцовак, якія будуць працаваць у горадзе. Напрыклад, у парку 60-годдзя Кастрычніка для ветэранаў вайны і працы наладзяць танцавальную праграму — яна пачнецца ў 12.30. А 14-й гадзіне на змену ім прыйдзе моладзь са сваёй музыкай. Акрамя выступленняў артыстаў эстрады, у парку наладзяць спартыўныя спаборніцтвы і нават майстар-класы народных майстроў.

**НАТАЛЕННЕ**

мастацтвам абяцаюць ля Мінскай гарадской ратушы, дзе а 13-й гадзіне адкрыецца «Летні вернісаж». Сталічныя мастакі пакажуць свае творы. Таксама іх падтрымаюць артысты і музыкі, якія сваімі выступленнямі расквецяць колеры беларускай сталіцы. Плошча Свабоды абяцае стаць плошчай Творчасці.

**ПАГЛЫБЛЕННЕ**

ў гісторыю краіны забяспечыць Сярэднявечны горад. Ён паўстане ля сталічнага Палаца спорту а 13-й гадзіне. Але забавы для дзяцей абяцаюць сучасныя: прафесійныя клоўны і жанглёры з беларускага цырка, папулярныя гурты, нават госці — дзеці з Расіі, якія ўдзельнічалі ў фестывалі дзіцячай творчасці.

У скверы імя Янкі Купалы будуць гучаць беларускія народныя песні. Праз іх дзеці і іх бацькі таксама спасцігаюць Беларусь. І забаўляюцца тут жа — хто ведае, можа праз пару стагоддзяў і катанне на электрамабілях будуць лічыць вельмі старажытнай забавай?..

**ДАЛУЧЭННЕ**

да акцыі «Беларусь — гэта мы» ў сталіцы адбудзецца ля стэлы «Мінск — горад-герой». А 21-й гадзіне тут пачнецца гала-канцэрт удзельнікаў акцыі. Сярод іх сёлета нават артысты Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам Аляксандра Анісімава, народны хор імя Цітовіча і аркестр імя Жыновіча, Прэзідэнцкі аркестр. Да носьбітаў высокага мастацтва далучацца любімыя папулярныя артысты: ансамблі «Песняры» і «Сябры», Аляксандр Ціхановіч і Ядзвіга Паплаўская, Ірына Дарафеева і Іна Афанасьева... Каб паслухаць усіх, трэба пратрымацца да дзвюх гадзін ночы. Самыя трывалыя ўбачаць гіганцкі (у 75 метраў) беларускі сцяг. А яшчэ можна будзе прадэманстраваць свае вакальныя здольнасці: без пяці хвілін дванаццаць гімн краіны спяваем разам. А потым разам глядзім феерверк.

**ПРЫЦЯГНЕННЕ**

тых, хто хоча прадоўжыць культурнае святкаванне, чакаецца на наступны дзень, 4 ліпеня. Нядзеля парадуе канцэртна-забаўляльнай праграмай ля Камароўскага рынка. Апоўдні тут пачнуць спяваць і танцаваць. І што цікава, у асноўным — дзеці, наша светлая будучыня, дзеля якой стараюцца працаваць дарослыя.

Удзень цікавая «тусоўка» чакаецца ў Сухарава: каля цэнтра «Свята», акрамя розных забаў, абяцаюць адмысловы шоу-паказ салона прыгажосці.

Павольна і прыемна правесці час у нядзелю можна будзе ў парку 60-годдзя Кастрычніка — ён будзе поўніцца гукамі духавога аркестра.

Але тых, хто зойдзе ў нядзелю ў сталічны Батанічны сад, парадуе адзін са знакамітых беларускіх духавых аркестраў — «Няміга». Іграць музыкантам выпадзе ў вельмі нязвычных умовах: на выспе пасярод возера! Берагі — для слухачоў.

**Ларыса БЕРАЗОЎСКАЯ.**

# Вялікая Айчынная ў люстэрку сацыялогіі

Ігар КАТЛЯРОЎ,
дырэктар Інстытута сацыялогіі НАНБ, доктар сацыялагічных навук, прафесар

**Сёння — свята вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі правёў сацыялагічныя даследаванні і агучыў стаўленне беларусаў да Вялікай Перамогі над фашысцкай Германіяй. Выбарка рэспандэнтаў будавалася па квотна-прапарцыянальнай схеме. Выбарачная сукупнасць апытаных прадстаўнікоў розных сацыяльных груп і рэгіёнаў краіны рэпрэзентатыўная, што дазваляе лічыць вынікі сацыялагічнага даследавання дакладнымі, якія адлюстроўваюць думку і ацэначныя меркаванні жыхароў Беларусі.**

Сацыёлагі высвятлялі, ці памятаюць жыхары нашай краіны пра падзеі Вялікай Айчыннай Вайны, ці шануюць тых, хто гераічна змагаўся за будучыню Радзімы.

Вынікі даследавання паказалі, што подзвігі нашых дзядоў і прадзедаў не забытыя. Іх помняць і ведаюць! Імі ганарацца! Па імені называюць сваіх дзядоў і прадзедаў, а таксама бабуль і іх сясцёр — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. З аналізу вынікаў даследавання можна зрабіць выснову, што калі б выпалі беларускім юнакам і дзяўчатам падобныя цяжкія выпрабаванні, яны б змагаліся за сваю Радзіму разам з бацькамі і дзядамі.

Пераважная большасць апытаных жыхароў Беларусі заявілі, што *Вялікая перамога Вялікага народа ў Вялікай вайне — гэта галоўная падзея мінулага стагоддзя.* Больш за тое, беларускі народ ацэньвае Вялікую Айчынную вайну як сімвал для ўсяго чалавецтва, а яе вынікі і наступствы — як выдатныя ў гісторыі нашай Айчыны і ў сусветнай гісторыі. Гістарычная памяць у Вялікай Айчыннай вайне, перамозе над фашызмам выступае структураўтваральным элементам духоўнага настрою беларускага народа, фактарам яго з'яднання і мабілізацыі на пераадоленне наяўных праблем, на вырашэнне эканамічных, сацыяльных і палітычных задач, якія стаяць перад імі. Перад усімі намі стаіць найважнейшая задача — захаваць гэту памяць у маладога пакалення на доўгія гады, сфарміраваць яе ў падрастаючага пакалення. Забываючы подзвігі сваіх продкаў, чалавек губляе той самы ўнікальны патрыятычны дух, які шануюць і паважаюць ва ўсім свеце. Да той пары, пакуль будзе жыць памяць пра перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне, Дзень Перамогі будзе адным з самых вялікіх і шанаваных святаў беларускага народа, а падрастаючыя пакаленні будуць працягваць справу сваіх бацькоў.

На пытанне *«З чым з ніжэйпералічанага ў першую чаргу ў вас асацыюецца ўдзел Беларусі і беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне?»* амаль палова жыхароў краіны заявіла — гэта вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, свята, якое мы адзначаем сёння. Сярод іншых адказаў рэспандэнты выбралі — масавы партызанскі рух (17,0 %), абарона Брэсцкай крэпасці (11,8 %) і г.д.

Стаўленне беларускага народа да свята Вялікай перамогі вельмі дакладна прасочваецца ў адказах на пытанне: *«Ці варта, на вашу думку, захоўваць сувязь найважнейшых дзяржаўных святаў Рэспублікі Беларусь да падзей Вялікай Айчыннай вайны?»* 87,7 % жыхароў краіны адказалі — так, паколькі гэта найважнейшая падзея ў гісторыі нашага народа, 2,4 — лічаць, што ў нашай гісторыі ёсць і больш значныя перыяды і падзеі. Трэба асабліва падкрэсліць, што прыкладна таксама думаюць і беларускія юнакі і дзяўчаты. Для 83,2 % з іх перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне — гэта найвялікшая падзея, якую яны ніколі не забудуць.

Сацыёлагі пыталіся: *«Якія пачуцці вы адчувалі ў сувязі з 65-годдзем Перамогі нашай краіны над фашысцкай Германіяй?».* 43,8 % жыхароў краіны адказалі — пачуццё ўдзячнасці ўдзельнікам вайны, якія выратавалі краіну ад прыгнёту, 31,5 % — пачуццё гонару за краіну, якая перамагла фашызм. Для юнакоў і дзяўчат працэнты яшчэ вышэйшыя — адпаведна — 45,9 % і 33,3 %.

Пераважная большасць грамадзян Рэспублікі Беларусь у цэлым задаволеныя тым, *як у Беларусі асвятляюцца падзеі Вялікай Айчыннай вайны.* Прычым 60,8 % атрымліваюць такую інфармацыю са сродкаў масавай інфармацыі, пятая частка — з асабістых гутарак з ветэранамі. Аднак у рэспандэнтаў шмат прэтэнзій да сістэмы адукацыі (школ, ВНУ). Сёння праз яе атрымліваюць інфармацыю пра Вялікую Айчынную вайну толькі 28,5 %, што значна менш, чым тры гады таму. Але асабліва крыўдна тое, што больш за палову юнакоў і дзяўчат атрымліваюць падобную інфармацыю не ў школе ці ВНУ, а з іншых крыніц. Акрамя таго, як сцвярджаюць многія рэспандэнты, за апошнія дваццаць гадоў у Беларусі не напісана ніводнага цікавага рамана пра Вялікую Айчынную вайну, які будуць чытаць будучыя пакаленні. Шмат прэтэнзій і да беларускага кіно. Маючы такія цудоўныя традыцыі, беларускія кінематаграфісты так і не змаглі стварыць новых нацыянальных шэдэўраў кшталту «Ляцяць журавы» ці «А світанкі тут ціхія».

У той жа час у некаторых сродках масавай інфармацыі, асабліва электронных, да гэтай пары не сціхае хваля фальсіфікацый адносна ролі Савецкага Саюза ў Другой сусветнай вайне. Ёсць палітыкі, якія наогул дагаварыліся да таго, што савецкаму народу трэба было здацца на міласць фашысцкай Германіі і жыць, як ва ўсіх «цывілізаваных краінах». Яны разважаюць так, як у свой час разважаў лакей Смердзякоў у рамане Ф.М. Дастаеўскага «Браты Карамазавы». У размове з Мар'яй Кандратаўнай ён сцвярджаў: «У дванаццатым годзе было на Расію вялікае нашэсце імператара Напалеона французскага першага, бацькі цяперашняга, і добра, каб нас тады скарылі гэтыя самыя французы: разумная нацыя скарыла б вельмі дурную і далучыла да сябе. Зусім нават былі б іншыя парадкі». Аднак сучасныя «лакеі Смердзяковы» не задумваюцца аб тым, што зрабіў бы фашызм з нашай краінай у выпадку сваёй перамогі. Што сёння не было б беларускай дзяржавы, не было б нацыі беларусаў.

Дзяржава, яе ўладныя структуры таксама адказныя за захаванне памяці пра вайну з фашызмам. Усе сацыяльныя абавязацельствы перад ветэранамі былі цалкам выкананыя. Дзяржава, палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні, працоўныя і вучэбныя калектывы, пошукавыя атрады і моладзевы рух павінны пастаянна весці патрыятычную работу сярод моладзі. Трэба пастаянна гаварыць, успамінаць, паказваць (праз помнікі, кнігі, фільмы і іншыя творы мастацтва) пра вайну і пра яе ўрокі, каб яны ніколі не забыліся ў чарадзе пакаленняў. У школьных падручніках павінна выкладацца дакладная, наступальная пазіцыя, якая датычыцца гісторыі Другой сусветнай вайны. Акрамя таго, кожны жыхар Беларусі можа зрабіць свой пасільны ўнёсак у захаванне гістарычнай памяці народа: расказаць сваім дзецям і ўнукам пра іх прадзеда — удзельніка Вялікай Айчыннай, дапамагчы наладзіць сустрэчу з ветэранамі ў школе, прынесці экспанаты ў школьны музей ці кветкі да мемарыяла, пасадзіць дрэва ля магілы загінулага воіна.

Ніхто не забыты, нішто не забыта — гэта не дзяжурны лозунг, гэта крык душы. Так у беларускім, шматпакутным грамадстве павінна быць заўсёды. Памяць пра перамогі ў мінулым аб'ядноўвае нас. Пакуль яна жывая, Рэспубліцы Беларусь не страшныя ніякія крызісы і напады. Таму памяць пра Вялікую перамогу ў Вялікай вайне неабходна захаваць назаўсёды. Як паказваюць сацыялагічныя даследаванні, жыхары Беларусі з гэтым цалкам згодныя.

## Абзац

◢ **У Гомелі ў Дзень Незалежнасці краіны пройдзе першы гарадскі конкурс крыкуноў. Вясёлае шоу будзе праходзіць падчас святочнай канцэртна-забаўляльнай праграмы «Беларусь — мая песня», у паўзах паміж канцэртнымі нумарамі. На сцэну будуць запрашаць крыкнуць гучнае «ўра!» усіх ахвотных. Пераможа той, у каго атрымаецца найбольш гучна і радасна. Як лічаць арганізатары, падстаў для звонкага вітання свайго горада, сваёй краіны, любімых людзей і сябе самога ў гэты дзень знойдзецца нямала.**

◢ Гродзенскія выратавальнікі знялі з адчыненага акна на 5 паверсе 3-гадовую дзяўчынку. Выратавальнікі атрымалі паведамленне, што ў адным з дамоў па праспекце Кляцкова ў Гродне на падваконні адчыненага акна 5 паверха сядзіць дзіця. На месца адразу ж выехалі атрад МНС, нарад міліцыі і медработнікі. Аказалася, што малая сядзіць на падваконні, звесіўшы ногі ўніз. Дзіця знаходзілася ў кватэры адно, без догляду, за замкнутымі на ключ двайнымі дзвярыма. З-за вялікай колькасці прыпаркаваных машын немагчыма было ўстанавіць аўталесвіцу да патрэбнай сцяны. Давялося ратаваць дзяўчынку, падняўшы штурмавую лесвіцу на дах. Адзін з супрацоўнікаў МНС спусціўся такім чынам на балкон кватэры, прайшоў у пакой і зняў дзіця. Як высветлілася, маці дзяўчынкі на момант здарэння была ў касцёле, дзе, як ні кур'ёзна гэта гучыць, слухала казань пра належны догляд дзяцей, паведамляе БЕЛТА.

◢ **У Драгічынскім раёне ў аўтааварыі з удзелам каровы пацярпела 23-гадовая жыхарка Піншчыны. Маладая жанчына, кіруючы аўтамабілем VW Passat, паспрабавала пазбегнуць сутыкнення з каровамі (яны выйшлі з-пад электрапастуха і апынуліся на дарозе) і знізіла хуткасць руху. Але пазбегнуць аварыі не ўдалося, бо адна з кароў рэзка наблізілася да машыны. Машына апынулася ў кювеце, жанчына з траўмамі і пераломам дастаўленая ў мясцовую бальніцу. Яе спадарожніца не пацярпела.**

◢ Ад пякучага сонца ў Лунінецкім раёне згарэла сена. 1 ліпеня ў СВК «Новае Палессе» загарэўся сенасклад. У выніку згарэла 70 т сена і шыферная абшыўка сенасховішча. Страты склалі каля Br18 млн. Папярэдняя прычына пажару — самазагаранне. Праводзіцца праверка.

## Поўны абзац



◢ **Брытанская тэатральная трупа Changeling Theatre Company правяла незвычайны эксперымент, паказаўшы сілу ўздзеяння тэатральнага мастацтва на надоі кароў. Адправіўшыся на адну з фермаў у графстве Кент, акторы сыгралі некалькі сцэн з п'есы «Віндзарскія свавольніцы» Шэкспіра. «Мы не хацелі засмучаць кароў і паказваць урыўкі з больш драматычных твораў класіка кшталту «Гамлета» ці «Макбета», — паведаміў адзін з артыстаў. У выніку натхнёныя каровы далі на 4% малака больш, чым у звычайныя, пазбаўленыя культурных акцый дні. Фермеры патлумачылі, што на надоі станоўча ўплывае ўсё, што супакойвае кароў, здымае з іх напружанне.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# Поглiд БЕЛАРУСЬ: КОШТ ВЫЗВАЛЕННЯ

*Раней тут уставала зямля*
*да нябёс,*
*А зараз гранітныя пліты...*
*Ніхто не збярог асабісты свой лёс,*
*Усе лёсы ў адзіны тут зліты...*

**У. Высоцкі.**

З афіцыйных крыніц вядома, што пры вызваленні краін Еўропы ад фашызму загінулі, памерлі ад ран ці прапалі без вестка 1080 тысяч воінаў Чырвонай Арміі. Самая вялікая іх колькасць — 600 тысяч — загінула на тэрыторыі суседняй Польшчы, па 140 тысяч у Венгрыі і Чэхаславакіі, 102 тысячы у Германіі, 69 тысяч у Румыніі.

Вядомыя таксама вялікія страты беларускага народа падчас Айчыннай вайны. Але да гэтага часу не было адказу на пытанне, якім коштам заплаціла Чырвоная Армія за вызваленне нашай, зараз незалежнай, Рэспублікі Беларусь? Рассакрэчаныя апошнім часам архівы дазваляюць адказаць на гэтае пытанне.

Першыя страты на беларускай зямлі Чырвоная Армія панесла ў так званай абарончай аперацыі, якая доўжылася з 22 чэрвеня па 9 ліпеня 1941 года. За гэты час яна страціла загінулымі і палоннымі палову свайго асабістага на той час складу — каля 340 тысяч чалавек, а нямецкія танкавыя кліны тым не меней дасягнулі падступаў да Полацка і Жлобіна. Разам з тым, была страчана вялікая колькасць цяжкай тэхнікі — 4800 танкаў, амаль 9500 гармат і каля 1800 самалетаў.

Разам з паражэннямі Чырвонай Арміі ў Прыбалтыцы і Заходняй Украіне гэта спарадзіла на савецка-германскім фронце дэфіцыт сілаў і сродкаў, страту кіравання, якія прывялі да эфекту «даміно». У выніку фронт адкаціўся да Масквы, Ленінграда, а пазней, у 1942 годзе — да Сталінграда і Каўказа, а Беларусь на тры гады трапіла пад варожую акупацыю.

Першая спроба вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прыходзіцца на кастрычнік 1943 года па лініі ад горада Невель на поўначы да вусця ракі Прыпяць на поўдні. Да гэтага часу нямецкая армія была вымушана стаць у глухую абарону з некалькіх палосаў, глыбіня якіх дасягала дзясяткаў кіламетраў. Пры яе пабудове вораг па-майстэрску выкарыстаў усе натуральныя перашкоды мясцовасці — розныя рэкі, азёры, лес, балоты і ўзвышшы. Таму беззваротныя страты Чырвонай Арміі былі занадта вялікімі — каля 65 тысяч чалавек. Але за гэты час былі вызвалены гарады Гарадок, Рэчыца і Гомель.

У першыя два зімовыя месяцы 1944 года былі вызвалены Мазыр, Калінкавічы і Рагачоў. На гэтым вызваленчая кампанія, якая доўжылася 6 месяцаў, на пэўны час спынілася. Агульныя беззваротныя страты на гэтых напрамках склалі амаль 85 тысяч чалавек без уліку параненых і загінулых у баях «мясцовага значэння».

Асабліва трагічна ў той жа перыяд развіваліся падзеі на Аршанскім, Магілёўскім і Віцебскім кірунках Заходняга фронту. Вызваленне гэтых гарадоў чакалася 10-12 кастрычніка 1943 года. З гэтай мэтай было праведзена некалькі наступальных аперацый, але амаль безвынікова, бо толькі у асобных месцах войскі прасунуліся на 7-13 кіламетраў. Перад горадам Дуброўна фронт канчаткова спыніўся. А вось беззваротныя страты ў гэтых аперацыях склалі 62 тысячы чалавек.

Пры гэтым адзначаецца асабліва кровапралітны і жорсткі характар баёў. А яшчэ былі слабае ўзаемадзеянне асобных родаў войскаў, тактычныя памылкі з нашага боку. Так, сведка і непасрэдны ўдзельнік тых падзей капітан Іван Трацдяк (потым вядомы савецкі генерал) у сваіх успамінах прыводзіць прыклад, калі нашы танкі на пачатку зімы пафарбавалі ў белы колер. Але напярэдадні атакі здарылася адліга, увесь снег растаў — і белыя танкі сталі добрымі мішэнямі на чорным фоне зямлі, тым не меней пайшлі насустрач сваёй пагібелі. І гэта пасля двухгадовага вопыту вайны. Абставіны баёў былі такімі, што загінулых часта немагчыма было не тое што пахаваць, а нават проста закапаць — яны заставаліся на палях, у балотах, рэках і азёрах. Узімку адзначаны выпадкі, калі немцы ўзводзілі брустверы сваіх акопаў з мёрзлых трупаў савецкіх салдат.

Такім чынам, спроба выйсці ў 1943 годзе на лінію Полацк — Лепель — Магілёў — рака Пціч, як гэта была запланавана Стаўкай ВГК, у поўным аб'еме не ўдалася. Пры гэтым беззваротныя страты асабовага складу за гэты перыяд дасягнулі амаль 137 тысяч, а агульныя страты — каля 585 тысяч чалавек. Апошняя лічба перавышае адпаведныя страты 1941 года ў 1,4 раза.

Другі этап вызвалення Беларусі пачаўся 23 чэрвеня 1944 года вядомай стратэгічнай аперацыяй «Баграціён». Чырвоная Армія да гэтага часу мела перавагу над ворагам па асабовым складзе амаль у два, а па цяжкім узбраенні і самалётах — каля 4 разоў. Перавага па танках і самаходных артылерыйскіх устаноўках дасягала 5,7 раза. Акрамя таго ў тыле нямецкіх войскаў дзейнічала цэлая партызанская армія — прыкладна да 370 тысяч чалавек, аб'яднаных у асобныя брыгады і злучэнні. Усё гэта дало адпаведны вынік.

3 ліпеня быў вызвалены Мінск, а 28 ліпеня — Брэст. На поўнае вызваленне беларускай зямлі спатрэбілася 37 сутак. Варожая абарона па ўсіх чатырох франтах была абрынута, а поўныя беззваротныя страты нямецкіх войскаў у выніку гэтай стратэгічнай аперацыі дасягнулі 500 тысяч чалавек. Па ацэнках асобных нямецкіх генералаў наступствы гэтага паражэння для Германіі сталі больш цяжкімі, чым пад Сталінградам.

Для Чырвонай Арміі вызваленне Беларусі далося таксама не так проста. Яе беззваротныя страты на беларускай зямлі за гэтыя 37 сутак склалі каля 100 тысяч чалавек. Была страчана таксама значная колькасць ваеннай тэхнікі — прыкладна 1600 танкаў, або трэцяя частка ад першапачатковай, 450 самалётаў, 1300 гармат і мінамётаў. Але эфектыўнасць аперацыі «Баграціён» значна перавышае першы этап вызвалення восені 1943 года. Гэта таксама бачна з суадносінаў беззваротных страт на асобных этапах вайны. Так, з агульнага ліку страт за час вайны на абарончы этап 1941 года прыходзіцца 60 працэнтаў, на першы вызваленчы этап восені-зімы 1943—44 гг.— 23, на другі вызваленчы этап летам 1944-га — 17 працэнтаў.

Такім чынам, агульныя беззваротныя страты Чырвонай Арміі на абарону і вызваленне беларускай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ва ўсіх стратэгічных і франтавых аперацыях Айчыннай вайны складаюць 576 тысяч чалавек. Гэта былі людзі розных нацыянальнасцяў Савецкага Саюза. Сярод іх былі і многія воіны-беларусы, якія першымі імкнуліся ступіць на вызваленую імі родную зямлю. Спіс загінулых дапаўняецца новымі прозвішчамі і ў наш час.

Помнік усім загінулым — наша Перамога ў Айчыннай вайне. Іх імёны і прозвішчы — на гранітных абеліcках і ў рэспубліканскіх кнігах «Памяць» па кожным горадзе і раёне Беларусі. Але загінулых людзей ніколі не вярнуць... Таму дні Перамогі і Вызвалення Беларусі для нас — іх нашчадкаў — заўсёды будуць і радаснымі і самотнымі аднначасова. Радасныя і самотныя яны і для мяне асабіста, бо з той кровапралітнай вайны не вярнуўся і мой бацька.

**Уладзімір ЯЦКЕВІЧ,**
**прафесар Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.**

## ФАЛЬШЫВАМАНЕТЧЫК... ХАЦЕЎ ДАПАМАГЧЫ КАХАНАЙ

НУ І НУ!

**Каб дапамагчы сваёй каханай тэрмінова аплаціць медыцынскія паслугі, 27-гадовы жыхар Віцебска вырашыў заняцца фальшываманецтвам. Прапанаваў свайму знаёмаму, у якога была хатняя аргтэхніка, адкрыць прыватную “друкарню” па вырабу грошай.**

У выніку надрукавалі 70 фальшывак кожная наміналам у 20 тысяч рублёў. Гэтыя самаробныя грошы закаханы перадаў дзяўчыне, яна – свайму брату. Апошні разам са сваім сябрам пачалі распаўсюджваць фальшывыя грошы. Расплачваліся імі ў крамах, грамадскім транспарце, нават куплялі латарэйныя білеты. Такім чынам збылі 10 фальшывых купюр. Як кажуць, папаліся, дзякуючы ўважлівасці кандуктара тралейбуса, якая засумнявалася ў сапраўднасці “дваццаткі”, якой хлопцы хацелі заплаціць за праезд. Яна адразу выклікала міліцыю. Адзін з удзельнікаў крымінальнай групы ўжо асуджаны судом Чыгуначнага раёна Віцебска. Той, хто прадставіў тэхніку для друкавання грошай, атрымаў тры гады абмежавання волі. У яго двое непаўналетніх дзяцей, мо і гэта паўплывала на параўнальную мяккасць прыгавору.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ЗВЫЧКА ХВАРЭЦЬ

**Каб менш працаваць, зваршчык падрабляў бальнічныя лісты.**

За тры гады, паводле звестак прэс-афіцэра Першамайскага РУУС Вольгі Куцько, хітрун выправіў дванаццаць «ліпавых» даведак, каб працягнуць па стане здароўя адпачынак ад працы. Усё выкрылася, калі на апошнім месцы працы кіраўнік звярнуў увагу на тое, што падначалены часта і вельмі працягла хварэе...

Між іншым, за тры гады фігурант гэтай справы змяніў не адно месца працы. А «падсеў» 36-гадовы зваршчык аднаго з прадпрыемстваў на бальнічную «іголку» ў 2007 годзе, калі захварэў: у апошні дзень бальнічнага яму захацелася працягнуць свой адпачынак па стане здароўя. З дапамогай хімічнага раствору ён выправіў дату заканчэння хваробы, ды настолькі па-майстэрску, што на прадпрыемстве ніхто нічога не заўважыў. Натхнёны гэтым зламыснік не адзін раз у наступным скарыстаўся падобным прыёмам. Як высветлілі супрацоўнікі міліцыі, у агульнай складанасці прайдзісвет падрабіў дванаццаць дакументаў аб часовай непрацаздольнасці. Праверка па гэтых фактах працягваецца, а махляру пагражае, як мінімум, немалы адміністрацыйны штраф.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## Беларускія клубы ўдала стартавалі ў еўракубках

Жодзінскае «Тарпеда» разграміла на сваім стадыёне ісландскі «Фалкір» — 3:0. На 52-й, 59-й і 66-й хвілінах вызначыліся Крывабок, Огар і Канцавы. А магілёўскі «Днепр» вязе з Албаніі нічыю — 1:1. Вызначыўся Дзмітрый Турлін. Тым часам сталічнае «Дынама», якое стартуе ў Лізе Еўропы з другога раўнда, выступае зараз на маскоўскім турніры камандаў-аднаклубнікаў — Кубку Яшына. У першым матчы падапечныя Уладзіміра Гольмака саступілі маскоўскім аднаклубнікам з лікам 1:2.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**


## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ *03 августа 2010 г.* ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В МИНСКОМ РАЙОНЕ

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 | Лот 6 | Лот 7 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода | Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода | Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода | Горанский с/с, д. Тейки | Самохваловичский с/с, д. Слобода, участок № 138 | Боровлянский с/с, д. Дроздово, У-73 | Ждановичский с/с, д. Тарасово, ул. Ключевая |
| 2 | Кадастровый номер | 623688006601000405 | 623688006601000406 | 623688006601000409 | 623681317601000001 | 623686304601000539 | 623680602601000843 | 623681709601001885 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1505 га | 0,1503 га | 0,1500 га | 0,1588 га | 0,1516 га | 0,1490 га | 0,1604 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 511 340 | 511 340 | 511 340 | 334 000 | 880 187 | 1 320 260 | 1 668 893 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 80 000 000 | 80 000 000 | 80 000 000 | 7 000 000 | 16 000 000 | 91 000 000 | 200 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 7 900 000 | 7 900 000 | 7 900 000 | 600 000 | 1 200 000 | 9 000 000 | 19 900 000 |

| | | Лот 8 | Лот 9 | Лот 10 | Лот 11 | Лот 12 | Лот 13 | Лот 14 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Острошицко-Городокский с/с, д. Галица | Острошицко-Городокский с/с, д. Галица | Острошицко-Городокский с/с, д. Галица | Сеницкий с/с, д. Атолино, участок № 58 | Сеницкий с/с, д. Атолино, участок № 201 | Сеницкий с/с, д. Атолино, участок № 202 | Сеницкий с/с, д. Атолино, участок № 204 |
| 2 | Кадастровый номер | 623685202101000120 | 623685202101000119 | 623685202101000118 | 623686600601000522 | 623686600601000516 | 623686600601000515 | 623686600601000514 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,0872 га | 0,1685 га | 0,1706 га | 0,1685 га | 0,1632 га | 0,1611 га | 0,1381 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 528 615 | 518 872 | 518 872 | 1 548 610 | 1 494 340 | 1 419 820 | 1 414 220 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 8 000 000 | 17 000 000 | 17 000 000 | 21 000 000 | 20 000 000 | 20 000 000 | 17 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 700 000 | 1 600 000 | 1 600 000 | 1 900 000 | 1 900 000 | 1 900 000 | 1 600 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 03.08.2010 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов 28.07.2010 г. Контактные телефоны: (8 025) 92 761 92, 204 11 62, 204 35 25.

Задаток на участие в аукционе на Лоты 1–3 перечисляется на расчетный счет Щомыслицкого сельисполкома № 3600621180202 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600537220 ОКПО 04432966, код платежа – 04901.

На Лот 4 – на расчетный счет Горанского сельисполкома № 3604621020052 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600537220, код платежа – 04901.

На Лот 5 – на расчетный счет Самохваловичского сельисполкома № 3600621150173 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520 УНП 600052424 ОКПО 04430482, код платежа – 04901.

На Лот 6 – на расчетный счет Боровлянского сельисполкома № 3600621010037 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал АСБ «Беларусбанк», ул. Карбышева, 13/2, г. Минск, УНП 600052345, код платежа – 04901.

На Лот 7 – на расчетный счет Ждановичского сельисполкома № 3600621030059 ГУ МФ РБ по Минской области (УНК 103), ф-л № 614 АСБ «Беларусбанк», код 520 УНП 600537220, назначение платежа – 04901.

На Лоты 8–10 – на расчетный счет Острошицко-Городокского сельисполкома № 3600621110139 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНН 600208279 ОКПО 04430447, код платежа – 04901.

На Лоты 11–14 – на расчетный счет Сеницкого сельисполкома № 3600621160189 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052409, ОКПО 04432966, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (В этом случае, местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении ему земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта).

3.1 Представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.



Минский городской центр недвижимости

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**
**26 июля 2010 года**

## ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже здания склада (здание хранилища (литер А 1/К), инвентарный номер 500/С-38265) общей площадью 1601,6 кв. м, расположенного по адресу: г. Минск, пр-д Масюковщина, д. 2, корп. 2. Площадь земельного участка – 1,5886 га.**

Начальная цена – 1 752 804 900 белорусских рублей.

Собственник помещения – ООО «НПКФ «Гиада». На продаваемое имущество обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней, примененных экономических санкций.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 170 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **26 июля 2010 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе, осуществляются **с 05.07.2010 по 23.07.2010** включительно в рабочие дни с 9.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости» (ул. К. Маркса, 39, 220030, г. Минск).**


**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне галоўнаму спецыялісту ўпраўлення электронных сродкаў масавай інфармацыі Лукашыку Вадзіму Генадзьевічу з выпадку напаткаўшага яго вялікага гора — смерці МАЦІ.**

Погляд

# ПАМЯРКОЎНАСЦЬ АЛЬБО ХАМСТВА?

## Няхай нас хваляць іншыя, але толькі не мы самі

**Пра беларусаў часта гавораць, што яны спакойныя, разважлівыя альбо, як мы самі любім пра сябе казаць, памяркоўныя. Усё гэта падаецца як элемент гістарычнай традыцыі, рыса менталітэту, што перадаецца з пакалення ў пакаленне. Нам, безумоўна, чуць такое, асабліва ад замежнікаў, прыемна: «Вось мы якія! Не тое што некаторыя». І тут адбываецца самае небяспечнае. Трапіўшы ў палон стэрэатыпаў і незаслужанай пахвалы, мы непрыкметна для саміх сябе расслабляемся, страчваем прынцыповую самаацэнку. А разам з гэтым, пэўна, страчваем тое, што сапраўды назапашвалася нашымі продкамі.**

**Таму, паважаныя землякі, давайце не звяртаць увагі на кампліментарныя выказванні ў свой адрас. Бо ў нашых жа інтарэсах падыходзіць да сябе строга, крытычна. І перш за ўсё ў тых сферах жыццядзейнасці, дзе ігнараванне пэўных нормаў і правілаў адным чалавекам прыводзіць да трагічных наступстваў не толькі для яго, але і іншых.**

**Так, гаворка зноў пойдзе пра парадкі, а дакладней, беспарадак, свавольствы на дарогах.**

### НАЛЕВА ЦІ НАПРАВА?

На сваёй першай прэс-канферэнцыі новы **начальнік Гродзенскай абласной Дзяржаўтаінспекцыі Сяргей ТАЛАТАЙ** зазначыў, што адносіны паміж удзельнікамі дарожнага руху ў любой краіне рэгулююцца не толькі Правіламі, але і традыцыямі, менталітэтам насельніцтва. Які ж ён, наш менталітэт? Спачатку задумаемся, бадай, аб галоўным: **ці паважаем мы закон?**

Даволі распаўсюджанае меркаванне пра тое, што беларусы — людзі вельмі законапаслухмяныя, пакорлівыя да «ўстановак» зверху (ёсць нават шмат анекдотаў на тэму «трэба дык трэба, што паробіш ...»). Але, на мой погляд, гэта — адзін з міфаў пра нашы нацыянальныя асаблівасці. Прапаную пераканацца ў гэтым не на нейкіх экстрэмальных прыкладах дарожна-транспартных здарэнняў (каб не было апраўданняў, што, маўляў, у сям'і не без вырадка), а на звычайнай, так бы мовіць, сітуацыі, якая штодня назіраецца ў Гродне.

Жыхары і госці абласнога цэнтра ведаюць, што каля гандлёвага цэнтра «Карона» ўжо даўно ўстаноўлены дарожны знак, які (пэўна, для прадухілення аварыйных сітуацый) забараняе кіроўцам з 10 да 18 гадзін паварот налева, патрабуючы павярнуць направа і толькі потым вярнуцца на патрэбную паласу. У выніку неабходна праехаць 300-400 «лішніх» метраў у параўнанні з варыянтам, калі адразу паварочваеш налева. Трэба дык трэба? Не падабаецца, але мусіш падпарадкавацца? Як бы не так ...

Хвілін за пяць маіх назіранняў з гандлёвага цэнтра выязджае сорак аўтамашын і толькі палова кіроўцаў (і тое добра?) выконвае патрабаванне дарожнага знака. Астатнія альбо яго не бачаць, альбо, што больш верагодна, «эканомяць» паліва ці час і тут жа паварочваюць налева. Пра такі «менталітэт» ужо добра ведаюць супрацоўнікі ДАІ і рэгулярна дзяжураць у гэтым месцы, спыняючы і штрафуючы парушальнікаў. І так паўтараецца з дня ў дзень, з месяца ў месяц. Дробязь? Але ці ж гэта не «люстэрка» нашай законапаслухмянасці, дакладней, яе адсутнасці ў, паводле ацэнкі аўтара гэтых радкоў, прыкладна паловы кіроўцаў?

Кіроўца, які павярнуў не направа, як таго патрабавала дарожная дысцыпліна, а налева, можа ў якасці апраўдання заявіць, што, выконваючы манеўр, ён у гэтай канкрэтнай сітуацыі не ствараў небяспекі іншым транспартным сродкам. Альбо нават паставіць пад сумненне мэтазгоднасць устаноўкі гэтага дарожнага знака. Але тут прынцыпова важна іншае — тое, што ў свядомасці дзясяткаў, соцень, тысяч людзей парушэнне правілаў дарожнага руху, падабаючца яны табе альбо не, не з'яўляецца нечым надзвычайным. Больш за тое, гэта ледзь не норма, асабліва калі побач няма даішніка. І як нахабна, па-напляваецельску да вызначаных заканадаўствам правілаў і ўсіх навокал гэта робіцца!

Вось яшчэ адна тыповая «карцінка з натуры». Цэнтр горада, транспартная «гадзіна пік». За рулём — малады чалавек альбо таксама маладая асоба прыгожага полу, вадзіцельскі стаж, хутчэй за ўсё, не перавышае некалькіх гадоў, а можа, і таго меншы. Аднак колькі ж упэўненасці ў сваіх здольнасцях! Рамянём бяспекі прышпіляцца неабавязкова. Трымаць адной рукой руль, а другой — мабільны тэлефон — ніякай праблемы. На гэта можна было б не звяртаць увагі, калі б такіх «спяцоў» сабралі ў адну кучу і дазволілі ездзіць па толькі для іх вызначанай дарозе. Але ж няма такіх «рэзервацый», яны ездзяць разам з усімі і ніхто не гарантаваны ад сутыкнення з гэтым хамствам.

Калі некаму з падобных кіроўцаў трапіць на вочы гэты артыкул, то адрасую толькі дзве просьбы. Першая — адносна карыстання мабільнай сувяззю за рулём аўтамабіля. Маладыя людзі, вы ж жывяце ў XXI стагоддзі, лепш за сваіх бацькоў, не гаворачы пра дзядоў, валодаеце тэхнічнымі сродкамі, камп'ютарам і тым жа «мабільнікам». Дапускаю, што без апошняга не абысціся нават падчас язды. Але няўжо для вас праблема зрабіць у салоне машыны так, каб, размаўляючы па тэлефоне, не трэба было адну руку адпускаць з руля? Гэта ж элементарна, ды і ў вашых жа інтарэсах. У адпаведнай кансультацыі, мажліва, не адмовяць нават у ДАІ.

**Паважаныя землякі, давайце не звяртаць увагі на кампліментарныя выказванні ў свой адрас. Бо ў нашых жа інтарэсах падыходзіць да сябе строга, крытычна. І перш за ўсё ў тых сферах жыццядзейнасці, дзе ігнараванне пэўных нормаў і правілаў адным чалавекам прыводзіць да трагічных наступстваў не толькі для яго, але і іншых.**

І другое: ні ў якім разе не ігнаруйце рамень бяспекі! Жыццём і навукай пацверджана, што яго выкарыстанне не зменшыць колькасць дарожна-транспартных здарэнняў і параненых, аднак рызыка смяротнага траўмавання скарачаецца на 45 працэнтаў.

Дарэчы, Гродзенская абласная Дзяржаўтаінспекцыя, запэўнівае яе кіраўнік Сяргей Талатай, мае намер размаўляць з кожным пакаленнем удзельнікаў дарожнага руху на зразумелай яму мове. Інспектары ДАІ, напрыклад, пойдуць не толькі ў дзіцячыя садкі і школы, але і ў начныя клубы, дзе «будзе чым здзівіць у добрым сэнсе». Аднак толькі намаганнямі Дзяржаўтаінспекцыі навесці парадак на дарогах нерэальна. «Калі ўсім грамадствам, адзіным фронтам не выступім — нічога не зменіцца», — перакананы Сяргей Талатай.

Аднак ці заклапочана гэтай праблемай грамадства? І наколькі шчырыя крокі робіць у гэтым кірунку? Яшчэ адзін факт для роздуму. Нядаўна праходзіла традыцыйная рэспубліканская акцыя «Увага, дзеці!», падчас якой кіроўцам рэкамендавалася ездзіць з уключаным блізкім святлом фараў незалежна ад таго, дзень на вуліцы альбо ноч. Дзеля агітацыі выкарыстоўваліся нават вялікія плакаты на кабінах аўтобусаў. І правільна. Вось толькі якога эфекту можна дабіцца, калі сам «агітатар» гэтае святло... не ўключае? Хоць, пэўна, зрабілі справаздачу аб праведзеным мерапрыемстве...

### «СТУКАЦТВА» ЦІ ПРЫНЦЫПОВАСЦЬ?

Статыстыка сведчыць, што за апошнія дзесяць гадоў на тэрыторыі Гродзеншчыны адбылося больш за 8 500 тысяч аварый з пацярпелымі людзьмі — дзве тысячы загінулых і каля дзевяці тысяч параненых. Прычым больш чым палова трагедый адбылася па прычыне ігнаравання хуткаснага рэжыму язды. Тым самым развенчваецца **яшчэ адзін міф — пра нашу ўзважанасць, асцярожнасць**.

З нядаўняга часу ДАІ праводзіць схаванае патруляванне на цывільных машынах з сістэмай відэафіксацыі. Неўзабаве на асноўных аўтадарогах вобласці з'явяцца і стацыянарныя відэакамеры. Перавысіў дазволеную хуткасць — атрымаеш па пошце паведамленне аб штрафных санкцыях, што ўжо даўно стала нормай у многіх краінах. Аднак...

— Пакуль ліхацтва за рулём не будзе ўспрымацца ўсімі ўдзельнікамі дарожнага руху як нешта ненатуральнае, вельмі цяжка будзе пераламаць гэту праблему адным адміністрацыйным рэсурсам, — лічыць Сяргей Талатай.

Як жа ўспрымаецца гэта надзённая задача нашым менталітэтам? Часта можна пачуць пра «стукацтва» ў Германіі, у тым сэнсе, што адны людзі паведамляюць у адпаведныя органы пра парушэнні іншых, у тым ліку і што датычыцца нормаў дарожнага руху. А вось мы — не «стукачы». Наадварот, праяўляем вадзіцельскую салідарнасць, сігналізуючы сустрэчнаму транспарту фарамі, што на трасе дзяжураць даішнікі.

Праўда, дзе тая салідарнасць, калі здарылася няшчасце? Так, у нас шмат неабыякавых да чужога гора людзей, якія заўсёды гатовыя падставіць сваё плячо ў цяжкую хвіліну. Нічога не патрабуючы ўзамен. Бо так выхаваныя бацькамі. Але ...

«Звязда» ўжо паведамляла пра вельмі ганебныя для вадзіцельскага супольніцтва (хоць ці існуе яно?) вынікі «праверкі на чалавечнасць», якая была праведзена супрацоўнікамі Гродзенскай абласной Дзяржаўтаінспекцыі і Чырвонага Крыжа. Нагадаем. Міма «чалавека, які ляжаў на дарозе» (ролю пацярпелага ў дарожна-транспартным здарэнні выконваў манекен) праехалі каля трыццаці машын, пакуль нарэшце адзін кіроўца не спыніўся. Не спяшаліся спыняцца і тады, калі перад «пацярпелым» паставілі аўтамабіль з уключанай аварыйнай сігналізацыяй і «кіроўца» — валанцёр, які быццам збіў пешахода, «галасаваў», заклікаючы аказаць дапамогу. Аднак машыны праносіліся міма...

А мірганучь фарамі, каб зменшылі хуткасць руху, хіба ж праблема ... Ліхач крыху збавіць свой спрыт, каб, праехаўшы кантроль, зноў абганяць праз двайную суцэльную лінію пры пад'ёме наверх, ствараючы пагрозу не толькі сабе, але і зусім невінаватым людзям. Дык чаму мы не павінны патэлефанаваць «102» і паведаміць дзяржнумар аўтамабіля гэтага хама, які, калі яго не спыніць, можа стаць злачынцам? Гэта «стукацтва»? Ці прынцыповасць, нармальная грамадзянская пазіцыя?

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**


## УПРАВЛЯЮЩИЙ В ПРОИЗВОДСТВЕ ПО ДЕЛУ О БАНКРОТСТВЕ

**извещает о проведении 20 июля 2010 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего республиканскому дочернему унитарному предприятию «Мозырский оптово-розничный Торговый комплекс» (РДУП «Мозырский ОРТК»), расположенного по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, ул. Иваненко, 13**

| п/п | Объект продажи | Характеристика объекта | Начальная цена продажи, (в т. ч. НДС 20 %) руб. | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| ЛОТ № 1 | | | | |
| 2 | **Здания двух складов, оборудование** | **Склад № 1** – одноэтажное здание, общая площадь 243,20 $м^2$, стены кирпичные, асбестоцементные листы, перегородки кирпичные, кровля шиферная, полы цементные, электроосвещение.<br>**Склад № 2 (основное)** – одноэтажное здание, общая площадь 670,14 $м^2$, стены кирпичные, металлические листы, перегородки кирпичные, кровля шиферная, полы цементные, электроосвещение.<br>**Пристройка (склад № 2)** – одноэтажное здание, общая площадь 316,60 $м^2$, стены кирпичные, асбестоцементные листы, перегородки кирпичные, кровля шиферная, полы цементные, электроосвещение.<br>**Уборная** – общая площадь 5,27 $м^2$;<br>**покрытие асфальтовое** 1844,63 $м^2$; **ограждение кирпичное** протяженностью – 40,6 м.п; **ворота металлические.** | **95 678 400** | **9 568 000** |

Торги проводятся в форме открытого аукциона без условий.

**Аукцион состоится: 20 июля 2010 года по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, ул. Иваненко, 13. Начало в 12.00.**

Объекты недвижимости находятся на земельном участке имеющие ограничение в использовании согласно Положения о порядке установления размеров и границ водоохранных зон и прибрежных полос водных объектов и режиме ведения в них хозяйственной деятельности, утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 21 марта 2006 г. № 377.

С перечнем и состоянием имущества можно ознакомиться по месту его нахождения.

Порядок подачи документов определен условиями проведения аукциона.

Для участия в аукционе участник перечисляет платежными поручениями задаток **на р/с 3012001320013, отделение ОАО «БПС-Банк» в г. Мозыре, МФО 151501354; Получатель платежа – РДУП «Мозырский оптово-розничный торговый комплекс». УНП 400083650.**

**Документы на участие в аукционе принимаются с даты опубликования информационного извещения по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, ул. Иваненко, 13 с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00 по рабочим дням до 19 июля 2010 года включительно.**

При подаче заявления представитель юридического лица должен иметь паспорт, доверенность на участие в аукционе и на подписание документов, нотариально заверенные в установленном порядке копии учредительных документов (устав, свидетельство о государственной регистрации), письменное решение соответствующего органа управления, разрешающее приобретение имущества (если это необходимо в соответствии с учредительными документами участника торгов); физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Шаг аукциона 5 %.

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь № 232 от 5 мая 2009 года «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)».

Победитель торгов обязан после подписания протокола о проведении аукциона: в течение 10 рабочих дней подписать договор купли-продажи, возместить расходы, связанные с проведением торгов, и расходы по изготовлению землеустроительных дел по выделению земельного участка.

**Контактные телефоны организатора аукциона: (029) 657 27 13, (029) 531 96 14.**


# Аўтастрахоўка па-новаму

Май на ўвазе

**УВАЙШЛІ ў сілу змяненні ў Палажэнне аб страхавой дзейнасці ў Беларусі, унесеныя ўказам Прэзідэнта № 519. Пра асноўныя новаўвядзенні на рынку страхавых паслуг для аўтаўладальнікаў расказала генеральны дырэктар Беларускай асацыяцыі страхоўшчыкаў Ірына МЕРЗЛЯКОВА.**

Па-першае, аформіць ДТЗ з нязначнымі пашкоджаннямі кіроўцы цяпер могуць самастойна. Гэта дасць магчымасць віноўніку здарэння пазбегнуць мераў адказнасці (штрафу альбо пазбаўлення права кіравання), якія былі б непазбежнымі, калі б на месца здарэння прыехалі супрацоўнікі ДАІ.

— Разабрацца на месцы без удзелу ДАІ дазваляецца пры ўмове, што транспартныя сродкі, якія сутыкнуліся, былі застрахаваныя; візуальна нанесены ўрон не перавышае 200 еўра; кіроўцы не маюць прэтэнзій адносна фізічнага стану (падазрэнне, што нападпітку) адзін да аднаго; прыйшлі да агульнага меркавання, хто вінаваты, а хто пацярпелы, — падкрэсліла мая суразмоўца. — Акрамя таго, трэба памятаць, што без супрацоўнікаў ДАІ могуць афармляцца ДТЗ толькі ў тым выпадку, калі ў абодвух яго ўдзельнікаў дагавор абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці заключаны пасля ўваходжання ўказа ў сілу (а гэта значыць пасля 1 ліпеня). Альбо калі хоць у аднаго з удзельнікаў ДТЗ ёсць поліс, набыты пасля 1 ліпеня. Пры наяўнасці абодвух полісаў, заключаных да 1 ліпеня, трэба выклікаць ДАІ. Гэта такія невялікія праблемы пераходнага перыяду.

Кампенсацыю, у гэтым выпадку, як прапісана ва ўказе, можна будзе атрымаць праз пяць дзён пасля звароту ў страхавую кампанію. Пры гэтым, звярніце ўвагу, калі спецыяліст палічыць, што велічыня шкоды будзе меншай за 200 еўра, выплаціць меншую суму, але калі шкода будзе большай за 200 еўра, выплаціць толькі 200. Пры гэтым колькасць страхавых выпадкаў не абмежавана на працягу дзеяння страхавога поліса.

Па-другое, аўтаўладальнікі Беларусі могуць выбраць: альбо заключыць дагавор абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці, альбо як разнавіднасць гэтага дагавора — дагавор комплекснага страхавання.

— Комплексны дагавор унутранага страхавання заключаецца тэрмінам ад 6 месяцаў да года, — тлумачыць Ірына Мерзлякова. — Ён уключае ў сябе, акрамя абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці аўтаўладальнікаў, яшчэ і добраахвотнае страхаванне транспартнага сродку на выпадак нанясення шкоды ў выпадку ДТЗ. Такім чынам, комплексны дагавор дае магчымасць віноўніку здарэння таксама атрымаць грашовую кампенсацыю за пашкоджаны аўтамабіль (ліміт 10 тысяч еўра).

Немалаважна адзначыць таксама, што новы від страхоўкі распаўсюджваецца толькі на ДТЗ з удзелам двух транспартных сродкаў, а дагавор комплекснага страхавання можа заключыць толькі рэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Што тычыцца кошту, то новы від страхавання будзе больш даступным сярэднезабяспечаным грамадзянам нашай краіны: комплексны поліс у сярэднім у тры з паловай разы даражэйшы за абавязковую страхоўку, але значна таннейшы, чым дагавор аўтаКАСКА.



**Без супрацоўнікаў ДАІ могуць афармляцца ДТЗ толькі ў тым выпадку, калі ў абодвух яго ўдзельнікаў дагавор абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці заключаны пасля 1 ліпеня.**

— Комплексны дагавор страхавання аўто з рухавіком да 1,8 л у Беларусі зараз каштуе для жыхароў сталіцы і абласных гарадоў каля 120-130 еўра ў год, — адзначыла Ірына Мерзлякова. — У сельскай мясцовасці з улікам паніжаючага каэфіцыента і зніжкі — каля 40-50 еўра на год. Пры гэтым у комплексным страхаванні рэгуляванне ўрону ідзе з улікам зносу транспартнага сродку, КАСКА можа пакрываць урон без уліку зносу. У асноўным жа комплекснае страхаванне накіравана на грамадзян — уладальнікаў недарагіх аўто. Бо ў Беларусі многія кампаніі машыну, якой больш як 10 гадоў, не бяруць на страхаванне КАСКА. Таму дзяржава прапанавала людзям вось такое выйсце з сітуацыі.

Па-трэцяе, цяпер страхавую кампенсацыю аўтаўладальнік можа атрымаць на працягу 20 працоўных дзён (раней даводзілася чакаць і па 40, і па 50 дзён). Гэта звязана з тым, што даведку з ДАІ можна будзе атрымаць адразу ж на месцы дарожна-транспартнага здарэння, агледзець транспартны сродак пры жаданні таксама будзе магчымым у дзень ДТЗ.

І, нарэшце, у пацярпелага з'явілася права выбару: ён можа падаць заяву як у страхавую кампанію вінаватага, так і ў тую кампанію, дзе ён застрахаваў свой аўтамабіль (да ўваходжання ўказа ў сілу ён, хацеў таго ці не, вымушаны быў звяртацца па кампенсацыю ў страхавую кампанію віноўніка). Віноўнік жа, па-ранейшаму, можа звярнуцца толькі да свайго страхоўшчыка.

**Надзея ДРЫЛА.**


Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов Республики Беларусь
**ЗАВЕРЕНО**
25 июня 2010 года
______________Кулаженко В.Г.

## КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
### ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ВТОРОГО ВЫПУСКА СЗАО «ЛАДАГАРАНТ»

(Утверждено Решением Наблюдательного совета СЗАО «ЛадаГарант» (Протокол б.н. от 11 мая 2010 г.))

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на белорусском и русском языках)**

на белорусском языке:

полное: Беларуска-англійскае сумеснае закрытае акцыянернае таварыства «ЛадаГарант»;

сокращенное: СЗАТ «ЛадаГарант»;

на русском языке:

полное: Белорусско-английское совместное закрытое акционерное общество «ЛадаГарант»;

сокращенное: СЗАО «ЛадаГарант».

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**

Республика Беларусь, 220089, г. Минск, ул. Грушевская, 91, помещении 4Н, телефон: (017) 2197822, телефон/факс: (017) 2197480, e-mail: info@lada.by.

**3. Основные виды деятельности эмитента**

Эмитент в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и своим уставом осуществляет следующие виды деятельности (в соответствии с общегосударственным классификатором «Виды экономической деятельности»):

- оптовая торговля и торговля через агентов, кроме торговли автомобилями и мотоциклами (51);
- общее строительство зданий (45211);
- хранение и складирование (63120);
- организация перевозок грузов (63400);
- прочее финансовое посредничество, не включенное в другие группировки (6523);
- другие виды деятельности в области финансового посредничества (65239);
- прочая деятельность на финансовых рынках (67122);
- подготовка к продаже недвижимого имущества (70110);
- покупка и продажа собственного недвижимого имущества (70120);
- сдача внаем собственного недвижимого имущества (70200);
- деятельность агентств по операциям с недвижимым имуществом (7031);
- управление недвижимым имуществом (70320);
- консультирование по вопросам коммерческой деятельности и управления (74140);
- деятельность по управлению холдинг-компаниями (74150);
- деятельность в области архитектуры, инженерные услуги (74201).

В соответствии с Перечнем видов деятельности, на осуществление которых требуются специальные разрешения (лицензии), и уполномоченных на их выдачу государственных органов и государственных организаций, утвержденным Декретом Президента Республики Беларусь от 14.07.2003 г. № 17, эмитент вправе осуществлять следующие виды деятельности:

- деятельность в области таможенного дела;
- проектирование и строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведение инженерных изысканий для этих целей;
- розничная торговля (включая алкогольные напитки и табачные изделия) и общественное питание;
- транспортно-экспедиционная деятельность.

**4. Сумма зарегистрированного уставного фонда**

Уставный фонд эмитента сформирован полностью в размере, предусмотренном Уставом: 280 188,39 (двести восемьдесят тысяч сто восемьдесят восемь и тридцать девять сотых) долларов США, что составляет 374 055 220 (триста семьдесят четыре миллиона пятьдесят пять тысяч двести двадцать) рублей (курс пересчета рубля к доллару составляет 1 доллар США – 1335 рублей по курсу Национального банка Республики Беларусь на 04.05.2001 г. — дата подписания Учредительного договора).

Свидетельство о факте формирования уставного фонда эмитента выдано Министерством иностранных дел Республики Беларусь № 3791СП-3306/2001 от 02.08.2002 г. на основании заключения аудитора-предпринимателя Бордун Е.В. от 26.07.2002 г.

**5. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном законодательством, и сроки ее публикации**

Бухгалтерская отчетность по итогам работы эмитента за 2010 год и последующие годы подлежит публикации не позднее трех месяцев со дня окончания отчетного финансового года в газете «Звязда».

**6. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии облигаций**

С более подробной информацией и проспектом эмиссии облигаций можно ознакомиться в течение срока размещения по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Беломорская, 23, помещение 1Н, комната 1-1, ежедневно в рабочие дни (кроме субботы и воскресенья) с 10.00 до 12.00. Тел. 8 (017) 290 00 55. Ознакамливающееся лицо имеет право читать и делать выписки из предоставляемых в соответствии с настоящим пунктом документов.

**7. Дата, номер государственной регистрации эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего**

Белорусско-английское совместное закрытое акционерное общество «ЛадаГарант» (далее – эмитент) зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 19.02.2010 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100934617.

**8. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение**

Решение о выпуске второго займа жилищных облигаций в соответствии с подпунктом 11.14.3. Устава эмитента принято Наблюдательным советом Общества 11 мая 2010 года, протокол б.н. от 11.05.2010 г.

**9. Форма выпуска и вид облигаций, объем эмиссии, количество, серия, номера:**

| | |
|---|---|
| **Форма выпуска и вид облигаций** | Жилищные, бездокументарные, именные, неконвертируемые |
| **Объем эмиссии** | 1 445 400 000 (один миллиард четыреста сорок пять миллионов четыреста тысяч) белорусских рублей |
| **Количество облигаций** | 365 (триста шестьдесят пять) штук |
| **Серия, номера облигаций** | ЛО-2, №№ 000001-000365 |

**10. Номинальная стоимость облигаций**

Номинальная стоимость одной облигации составляет 3 960 000 (три миллиона девятьсот шестьдесят тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный 1 (одному) метру квадратному общей площади жилья в строящемся жилом доме в рамках объекта «Многоэтажный жилой дом с объектами соцкультбыта и многоуровневая стоянка для автомобилей со встроенно-пристроенными помещениями автоцентра в квартале застройки в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса. 1-й этап», в г. Минске, без учета отделочных работ.

Эквивалент номинальной стоимости облигаций не подлежит изменению в течение срока обращения облигаций настоящего выпуска.

Общий эквивалент номинальной стоимости облигаций составляет 365 (триста шестьдесят пять) квадратных метров.

Проектом предусматривается строительство 13-этажного 6-секционного 395-квартирного жилого дома на территории сносимой малоэтажной застройки на пересечении проспекта Дзержинского и проспекта Жукова. В нижнем уровне запроектирована полуподземная гараж-стоянка на 35 м/мест с отдельным въездом-выездом на дворовую территорию с эксплуатируемой кровлей, магазины «Промтовары», «Детский мир», «Электроника», меховое ателье, встроенно-пристроенный ресторан на 50 посадочных мест с летней террасой-кафе и офисные помещения в 2-х нижних этажах.

Вдоль пр. Жукова предусмотрено размещение отдельно стоящей многоуровневой (4-5 этажей) автостоянки с 2-мя однопутными рампами в торцах на расстоянии 35 м до жилого дома. На первом этаже располагается: автосалон со вспомогательными помещениями, СТО, помещения предпродажной подготовки, ручная механическая мойка, помещение приема заказов, бар, другие административные и вспомогательные помещения. На 2-5 этажах – стоянки автомобилей вместимостью 294 м/места.

В проекте выделено два пусковых комплекса. В состав 1-го пускового комплекса включены 4 секции жилого дома, две гостевые автостоянки на 5 и 10 м/мест и временные въезды, благоустройство придомовой территории, трансформаторная подстанция и реконструкция ул. Шатько. В состав 2-го пускового комплекса входят 2 жилые секции, оставшаяся часть автостоянки, встроенно-пристроенные объекты и многоуровневая стоянка с автоцентром, гостевая автостоянка на 99 м/мест, 4 гостевые автостоянки на 9,7,8 и 7 м/мест, проезд вдоль пр. Жукова и благоустройство всей прилегающей территории.

**11. Цель выпуска облигаций**

Выпуск облигаций осуществляется в целях обеспечения финансирования строительства жилого дома, указанного в п. 10 Краткой информации.

**12. Период проведения открытой продажи облигаций**

Датой начала открытой продажи облигаций является 6 июля 2010 года.

Датой окончания открытой продажи облигаций является 24 августа 2012 года.

**13. Место и время проведения открытой продажи облигаций**

Размещение облигаций осуществляется путем открытой продажи физическим и юридическим лицам – резидентам и нерезидентам Республики Беларусь в соответствии с законодательством Республики Беларусь. До момента покупки облигаций покупатели должны заключить с эмитентом договор в простой письменной форме, предусматривающий обязательства эмитента по строительству жилых помещений владельцам жилищных облигаций.

Для приобретения облигаций покупатели могут обратиться к профессиональному участнику рынка ценных бумаг ОАО «ДЕРЖАВАИНВЕСТ», начиная с даты начала открытой продажи, ежедневно в рабочие дни (кроме субботы и воскресенья) с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Беломорская 23, помещение 1Н, комната 1-1.

**14. Срок обращения облигаций**

Срок обращения облигаций устанавливается с 6 июля 2010 года и ограничивается 1 сентября 2012 года включительно и составляет 788 дней.

**15. Дата начала погашения облигаций**

Датой начала погашения облигаций является 1 сентября 2012 года.

**16. Доход по облигациям**

Доход по облигациям не начисляется и не выплачивается.

**17. Условия и порядок досрочного погашения облигаций**

В случае досрочного окончания строительства объекта недвижимости, указанного в п. 8 Решения, эмитент может объявить о досрочном погашении облигаций.

**18. Порядок погашения облигаций. Дата формирования реестра владельцев облигаций**

18.1. Владелец облигаций при погашении (досрочном погашении) облигаций имеет право получить номинальную стоимость облигаций либо жилое помещение, общая площадь которого соответствует эквиваленту номинальной стоимости принадлежащих ему жилищных облигаций, выраженному в квадратных метрах.

Владельцы облигаций определяются на основании реестра владельцев облигаций. Эмитент формирует реестр владельцев облигаций за пять рабочих дней до даты начала погашения (досрочного погашения) облигаций.

18.2. В случае намерения получить при погашении (досрочном погашении) облигаций их номинальную стоимость владелец облигаций должен не позднее, чем за тридцать календарных дней до даты начала погашения (досрочного погашения) облигаций в письменной форме уведомить эмитента о таком намерении.

18.3. В случае намерения получить при погашении (досрочном погашении) облигаций соответствующее жилое помещение, в день начала погашения (досрочного погашения) облигаций владелец облигаций и эмитент подписывают акт приемки-передачи соответствующего жилого помещения.

После подписания акта ввода в эксплуатацию объекта жилищного строительства, государственной регистрации создания объекта жилищного строительства и при условии выполнения владельцем облигаций обязательств по договору с эмитентом эмитент в двухмесячный срок передает владельцу облигаций документы, необходимые для оформления в установленном порядке права собственности на жилое помещение. После государственной регистрации такого права эмитент должен передать владельцу облигаций жилое помещение, комплект ключей и документы на установленное оборудование.

18.4. При погашении (досрочном погашении) облигаций владелец облигаций должен перевести облигации на счет «депо» эмитента в день начала погашения облигаций.

**19. Условия и порядок приобретения облигаций эмитентом до даты начала их погашения**

19.1. В период обращения облигаций эмитент вправе осуществлять приобретение (выкуп) облигаций у любого их владельца по цене, определяемой соглашением эмитента и владельца облигаций.

19.2. При неисполнении эмитентом обязательств по договору, указанному в п. 13 Краткой информации, владельцы облигаций вправе потребовать полного возмещения причиненных им убытков, а также возврата внесенных в оплату стоимости жилого помещения путем приобретения облигаций денежных средств, проиндексированных путем умножения на коэффициент, определяемый отношением действующего на фактическую дату возврата средств индекса изменения стоимости строительно-монтажных работ, утверждаемого Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь по каждой области и г. Минску, к аналогичному индексу, действовавшему на дату перечисления владельцами облигаций денежных средств в оплату стоимости жилого помещения путем приобретения облигаций на счет эмитента.

Индексы изменения стоимости строительно-монтажных работ определяются в соответствии с официально опубликованными данными Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь.

Возврат владельцам облигаций денежных средств, внесенных в оплату стоимости жилого помещения путем приобретения облигаций, в полном объеме осуществляется не позднее 6 месяцев с момента подписания акта о расторжении договора с эмитентом (постановления суда – в случае отказа одной из сторон от подписания названного акта).

**20. Условия и порядок возврата средств инвесторам при признании выпуска несостоявшимся, запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам**

В случае признания выпуска облигаций несостоявшимся, запрета Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска облигаций эмитент в срок не позднее 30 дней с момента принятия указанного решения возвращает владельцам облигаций денежные средства, направленные на покупку облигаций.

**21. Дата и номер государственной регистрации облигаций**

Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 25 июня 2010 года.

Регистрационный номер: № 5-200-02-0642.

**22. Информация об обеспечении исполнения обязательств**

Исполнение обязательств по облигациям обеспечивается залогом недвижимого имущества.

Состав залогового имущества: объекты недвижимого имущества:

| Инв. № | Наименование | Площадь, кв. м. |
|---|---|---|
| 550/D-703783 | Административное помещение (код 4 02 02) | 169,10 |
| 550/D-703784 | л.9-10/БЛ Административное помещение | 100,00 |
| | **ИТОГО** | 269,10 |

Рыночная стоимость залогового недвижимого имущества в соответствии с внешней оценкой (Заключением об оценке № 10-06 от 28.01.2010 г., исполнитель оценки – УП «Оценка и управление собственностью»), расположенного по адресу:

инв. № 550/D-703783 – г. Минск, ул. Грушевская, д. 91, пом. 11Н;

инв. № 550/D-703784 – г. Минск, ул. Грушевская, д. 91, пом. 13Н,

составляет 628 000 (шестьсот двадцать восемь тысяч) долларов США или 1 809 896 000 (один миллиард восемьсот девять миллионов восемьсот девяносто шесть тысяч) белорусских рублей.

Общий размер обязательств по облигациям составляет 79,86 (семьдесят девять целых восемьдесят шесть сотых) процента от стоимости недвижимого имущества, обременяемого залогом.

Обеспечение по обязательствам эмитента в отношении облигаций действует в течение 90 (девяноста) дней с даты начала погашения облигаций.

**23. Оплата облигаций**

Оплата облигаций производится путем безналичного расчета в установленном порядке. Денежные средства на оплату облигаций подлежат перечислению на расчетный счет эмитента.

Размещение облигаций осуществляется по их номинальной стоимости.

Внесение юридическими и физическими лицами денежных средств эмитенту, а равно эмитентом при выплате стоимости облигаций их владельцам в предусмотреных Решением случаях осуществляется в валюте номинала облигаций.

**24. Порядок обращения облигаций**

Обращение облигаций осуществляется среди физических и юридических лиц на внебиржевом и/или биржевом рынке в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Для своевременного формирования депозитарием эмитента реестра владельцев облигаций сделки с облигациями на вторичном рынке прекращаются за 5 рабочих дней до даты начала погашения (досрочного погашения) облигаций.

**Директор**
**СЗАО «ЛадаГарант»** **Живулько С.В.**

**Бухгалтер**
**СЗАО «ЛадаГарант»** **Карпинская Л.Д.**

*Лицензия на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведение инженерных изысканий для этих целей» действительна до 29.11.2014 г. Свидетельство о государственной регистрации выдано 19 февраля 2010 года Минским горисполкомом. УНП 100934617.*

# ГАЮЧЫЯ ТРАВЫ ЛІПЕНЯ

Лечымся без лекаў

### ПАЛЫН ГОРКІ

Самае каштоўнае ў расліне — верхняя частка сцябла з кветкамі.

Прымяняецца пры хваробах, якія суправаджаюцца сакраторнай недастатковасцю страўнікава-кішачнага тракта без вострых праяў запалення. Танізуе нервовую сістэму, павышае апетыт, паляпшае страваванне, павялічвае слінааддзяленне, актывізуе выдзяленне стрававальных ферментаў і жоўці. Для гэтага яго прымаюць у выглядзе адвару або настойкі.

Для прыгатавання адвару заліце 3 ч. лыжкі сухой здробненай сыравіны 1 шклянкай гатаванай вады, пракіпяціце 10 хвілін, працадзіце, адцісніце, давядзіце аб'ём гатаванай вадой да зыходнага. Прымайце па 1 ст. лыжцы 3 разы на дзень да яды.

Настойка гатуецца так: заліце сухую здробненую траву медыцынскім спіртам у суадносінах 1:5 і трымайце 7—10 дзён у цёмным месцы. Працадзіце. Прымайце па 15—20 кропляў 3 разы на дзень за паўгадзіны да яды.

Супрацьпаказанні. Цяжарнасць, язвавая хвароба, індывідуальная непераноснасць.

### РАМОНАК

Самае каштоўнае — суквецці расліны.

Рамонак эфектыўны пры страўнікавых захворваннях (язве, гастрыце), хваробах жоўцевага пузыра. Для гэтага заварвайце яго як гарбату: вазьміце 1 ч. лыжку суквеццяў на шклянку кіпеню, настойвайце 30 хвілін.

Пры ранах, запаленнях слізістай рота дапамагае паласканне адварам рамонку. Для яго прыгатавання заліце 1 ст. лыжку суквеццяў шклянкай кіпеню, дайце настояцца дзве гадзіны, працадзіце.

Калі вас непакоіць хранічны насмарк, гаймарыт, палашчыце насаглотку адварам рамонку, уцягваючы яго ў нос.

### САРДЭЧНІК (ГЛУХАЯ КРАПІВА)

Самае каштоўнае — верхняя частка расліны разам з кветкамі.

Прымяняецца як заспакаяльны сродак пры павышанай нервовай узбуджальнасці, бяссонніцы, сардэчна-сасудзістых захворваннях, вегетасасудзістай дыстаніі, у клімактэрычны перыяд. Сардэчнік рэкамендуецца пры метэарызме, спастычных болях. Універсальная форма прымянення — настой. Для яго прыгатавання заліце 1 ст. лыжку сыравіны шклянкай кіпеню, настойвайце 40 хвілін. Працадзіце, выпіце за тры прыёмы на працягу дня.

### ТРЫПУТНІК ВЯЛІКІ

Самае каштоўнае — лісце.

Трыпутнік паніжае артэрыяльны ціск і ўзровень халестэрыну ў крыві. Добры як супрацьзапаленчы сродак, разрэджвае макроту пры кашлі. Павышае кіслотнасць страўніка, здымае спазмы. Для гэтых мэтаў трыпутнік прымяняецца ў выглядзе настою: заліце 3 ч. лыжкі сухога здробненага лісця шклянкай кіпеню і настойвайце 6—8 гадзін. Прымайце па 1/3 шклянкі 3 разы на дзень да яды.

Сок свежага лісця трыпутніку выкарыстоўваюць для прамывання ран, пролежняў, поласці рота пры запаленні. Для гэтага лісце старанна прамываюць у праточнай вадзе, а затым апалоскваюць цёплай гатаванай. Дробна наразаюць і прапускаюць праз мясарубку або праз сокавыціскалку.

### ХВОШЧ ПАЛЯВЫ

Самае каштоўнае — уся зялёная частка.

Настой хвашчу — добры мачагонны, гіпатэнзіўны, агульнаўмацавальны сродак. Эфектыўны ён як кровaспыняльнае пры лёгачных, матачных, гемараідальных, насавых крывацёках, а таксама як супрацьзапаленчае пры хваробах мачавога пузыра.

Для прыгатавання настою: 1 ст. лыжку хвашчу заліце шклянкай кіпеню, настойвайце дзве гадзіны, працадзіце. Выпіце ў тры прыёмы на працягу дня.

Настой хвашчу дапамагае пры вугрыстым сыпе, тлустай скуры твару. Для прыгатавання маскі супраць вугроў запарце траву ў невялікай колькасці кіпеню і накладвайце на твар цёплую кашку (па 15 хвілін праз дзень).

Увага! Прэпараты хвашчу не рэкамендуецца прымяняць пры цяжкіх пашкоджаннях нырак.

### ЧЫСТАЦЕЛ

Самае каштоўнае — надземная частка расліны.

Дзякуючы супрацьгрыбковым і бактэрыцыдным уласцівасцям, чыстацел лечыць многія скурныя хваробы, у тым ліку і себарэю. Для гэтага вазьміце 2 ч. лыжкі травы, заліце шклянкай кіпеню і настойвайце 2—3 гадзіны. Пасля настой працадзіце і ўціpайце ў валасістую частку галавы. Галаву абвяжыце ручніком. Праз 15—20 хвілін валасы прамыйце.

Свежым сокам і здробненай травой чыстацелу выводзяць барадаўкі, мазалі, рабацінне, змазваюць трэшчыны на пятках. Працэдуру праводзяць 3—4 разы на дзень.

Сок чыстацелу аказвае і супрацьспазматычнае дзеянне. Для гэтага яго прымаюць па 20—40 кропляў, разводзячы ў вадзе.

Супрацьпаказанні. Эпілепсія, бранхіяльная астма, стэнакардыя, цяжарнасць. Чыстацел ядавіты, таму яго ўжыванне ў вялікіх дозах можа прывесці да атручэння.

Увага! Перш чым прымяняць народныя сродкі, пракансультуйцеся са сваім лечачым урачом.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

## ПАЛІКЛІНІКА ДАПАМОЖА ЗАЛЕЖНЫМ

**Да 7 ліпеня 18-я гарадская паліклініка г. Мінска праводзіць прафілактычную акцыю «Беларусь супраць наркотыкаў і алкаголю» пад дэвізам «Працоўная моладзь — моцная Беларусь».**

Паводле слоў **намесніка галоўнага ўрача па медыцынскай часці 18-й гарадской паліклінікі Таццяны ЗАЙЦАВАЙ**, ва ўстанове праводзіцца шэраг мерапрыемстваў па прапагандзе здаровага ладу жыцця і прафілактыцы розных залежнасцяў. У актавай зале да 7 ліпеня паліклінікі штодня ў 13.00 праходзіць цыкл спецыяльных тэматычных лекцый. У даведачным акне медустановы можна атрымаць інфармацыю аб магчымасцях аказання медапамогі ў дзяржаўных установах сталіцы асобам, якія ўжываюць наркатычныя рэчывы і алкаголь.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

По чутках і кампетэнтна

# Чорны з'еш сам, а белы...

*Адно расійскае выданне спрабуе развянчаць дасягненні «вялікай сельскагаспадарчай рэвалюцыі». Маўляў, са з'яўленнем хлеба ў жыццё чалавецтва ўвайшлі і хваробы, і смерць. Нейкі прафесар Ларэйн Кардэн першым усвядоміў пагрозу і тут жа прыдумаў палеадыету. Заключаецца яна ў тым, каб... ні хварэць, ні паміраць — напэўна, так. Як паведамляе аўтар публікацыі, усяго толькі і трэба, што знізіць ужыванне зерневых прадуктаў і харчавацца агароднінай, садавінай, посным мясам і дарамі мора. Насамрэч спіс ад агародніны да морапрадуктаў вельмі дастойны і ніводзін дыетолаг не скажа тут нічога супраць. Але што наконт зерневых?*

*Журналіст не на жарт палохае чытача, маўляў, за атлусценнем, дыябетам, інфарктамі, інсультамі, інфекцыямі, карыесам, малакроўем, астэапарозам, камянямі ў нырках і г.д. хаваюцца... фітаты — рэчывы, якія ўтрымліваюцца ў злаках і перашкаджаюць засваенню многіх мікра- і макраэлементаў. І далей: «...хлеб, крупы, сыры, тлустае мяса, саленні і вяндліна закісляюць арганізм, спрыяючы развіццю гіпертаніі, узнікненню інсультаў, астмы, астэапарозу і ўтварэнню ў нырках камянёў...».*

**Загадчык аддзела гігіены харчавання Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гігіены Васіль ЦЫГАНКОЎ:**

— Што да «акіслення арганізма», то так можа выказвацца хіба той, у каго была «двойка» па хіміі... Фітаты ж, якія адносяцца да антыхарчовых рэчываў, утрымліваюцца ў многіх раслінных прадуктах. Але 90 працэнтаў фітатаў у звычайным рацыёне прыпадае на злакавыя культуры, асабліва на прадукты, якія ўтрымліваюць шмат вотруб'я.

Колькасць ужытых намі фітатаў можа паўплываць на тое, колькі кальцыю, жалеза і цынку мы атрымліваем з ежы. І вось узнікае здагадка, што празмернае ўжыванне фітатаў можа прывесці да дэфіцыту мінералаў. Але гэта толькі меркаванне, якое не пацвярджаецца на практыцы. Многія прадукты з фітатамі і багатыя на жалеза ўраўнаважваюць дзеянне фітатаў. Больш за тое, вітамін С нейтралізуе ўздзеянне апошніх, а збалансаваны рацыён заўсёды змяшчае досыць многа вітаміну С.

Амерыканская асацыяцыя дыетолагаў і Міністэрства сельскай гаспадаркі, рыбнай і харчовай прамысловасці Вялікабрытаніі зрабілі заключэнне: фітаты не аказваюць вызначальнага ўздзеяння на ўтрыманне кальцыю ў арганізме. Няма таксама ніякіх падстаў лічыць, што людзі, якія ўжываюць разнастайную і здаровую ежу з высокім утрыманнем фітатаў, могуць пакутаваць ад дэфіцыту цынку. Многія прадукты, багатыя на фітаты, напрыклад, цэльныя збожжавыя, змяшчаюць таксама вялікую колькасць згаданага мінералу. Пратэін аслабляе ўздзеянне фітатаў на засваенне цынку. Таму той, хто здавальняе свае патрэбы ў пратэіне, атрымлівае дадатковую гарантыю таго, што арганізм не будзе пакутаваць ад дэфіцыту мінералу...

Менавіта з хлебам, нароўні з рознымі крупамі і стравамі з іх, чалавек павінен атрымліваць асноўную частку вугляводаў. Размова, безумоўна, ідзе пра жытні, чорны і шэры гатункі. Батоны, булкі, смажні і чабурэкі тут ні пры чым. Іх колькасць можна смела і істотна абмяжоўваць, як гэта рэкамендуецца рабіць у дачыненні да ўсіх іншых лёгказасваяльных вугляводаў — пячэння, цукерак, пірожных, цукру і г.д.

Дарэчы, у Еўропе цяпер вырабляецца вялікая разнастайнасць чорнага і шэрага хлябоў высокай якасці. А ўсё таму, што хлеб — карысны, гэта асноўная крыніца вітамінаў групы В. Сутачная норма для здаровага чалавека — 200-250 грамаў. У такім варыянце хлеб могуць ужываць і гіпертонікі, і іншыя катэгорыі грамадзян з хранічнымі захворваннямі. Іншая рэч, дыябетыкам, напрыклад, як і ва ўсіх іншых выпадках трэба лічыць хлебныя адзінкі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Курортны сезон

# СОНЦА НЕ ЗАЎСЁДЫ БЫВАЕ Ў РАДАСЦЬ

**Пазагараць на сонечнай палянцы паблізу рачулкі або на заморскім пляжы ля мора любяць многія. Да таго ж пэўная колькасць сонечных промняў карысная для здароўя: большая частка вітаміну D, у якім мае патрэбу арганізм, дастаецца нам разам з загарам. Але часам сонечныя ванны могуць прынесці і шкоду. Вядомая вялікая група хваробаў скуры, калі ў чалавека адзначаецца павышаная адчувальнасць да промняў ультрафіялетавага спектра. Такія паталагічныя станы атрымалі агульную назву — фотадэрматозы. Сімптомы іх праяўляюцца не адразу, і таму хворы часта не звязвае высыпкі на скуры з уплывам сонца. Толькі спецыяліст зможа дакладна паставіць дыягназ і прызначыць правільнае лячэнне.**

Фотадэрматозы могуць працякаць востра або хранічна. Класічны прыклад фотаадчувальнага дэрматозу — хранічная чырвоная ваўчанка, ад якой часцей за ўсё церпяць жанчыны ва ўзросце 20—40 гадоў. Хвароба правакуецца сонечнымі промнямі і прыносіць вялікія непрыемнасці. Яркі сімптом захворвання — так званы «матылёк», размяшчэнне ачагоў пашкоджання на скуры шчок па абодвух баках носа. Тым, хто мае чырвоную ваўчанку, зусім нельга знаходзіцца на сонцы, перад выхадам на вуліцу ў сонечнае надвор'е рэкамендуецца выкарыстоўваць сонцаахоўныя мазі і крэмы. Гэтым людзям даводзіцца заўсёды засцерагаць скуру ад ультрафіялетавых промняў, выбіраць закрытае адзенне, шыракаполыя капелюшы, карыстацца цёмнымі акулярамі.

Некаторыя пакутуюць ад такіх фотадэрматозаў, як сонечная крапіўніца, сонечная пачасуха, светлавая воспа. Пры розных клінічных праявах іх аб'ядноўвае тая ж павышаная адчувальнасць — рэцыдывы скурных высыпак у сонечнае надвор'е.

Даволі часта ў людзей пасля 40—50 гадоў, асабліва ў тых, хто мае паталогію страўнікава-кішачнага тракта, узнікаюць ружовыя вугры. Павышаная адчувальнасць да сонца — адна з прычын гэтай хваробы. Часта ў такіх выпадках родныя або знаёмыя раяць (па аналогіі з юнацкімі вуграмі) пабыць на сонцы або прайсці сеанс кварцавання, што яшчэ больш ускладняе сітуацыю. Таму перш чым «прызначыць» сабе такое лячэнне, трэба вызначыць сапраўдную прычыну хваробы.

Незвычайныя і нечаканыя рэакцыі на сонца могуць узнікаць і ў людзей, якія не мелі раней скурных немачаў. Такое бывае, калі чалавек прымае медыкаменты, якія валодаюць здольнасцю павышаць адчувальнасць арганізма да ўльтрафіялету, і, не ведаючы пра такую ўласцівасць прэпарата, шмат часу праводзяць на сонцы. Спектр такіх лекаў дастаткова шырокі, і яны даволі часта ўжываюцца. Гэта антыбіётыкі тэтрацыклінавага віду, фторхіналоны, сульфаніламіды. Спіс прэпаратаў пастаянна пашыраецца.

Фотаалергічныя рэакцыі магчымыя таксама пры вонкавым прымяненні лекаў з утрыманнем дзёгцю. Акрамя таго, фотадэрматыты могуць выклікаць расліны, якія ўтрымліваюць фуракумарын: інжыр, шыпшына, канюшына, лімон і іншыя цытрусавыя.

Безумоўна, хацелася б атрымліваць асалоду ад сонечнага надвор'я без непрыемных наступстваў. Часткова гэтаму могуць дапамагчы касметычныя прэпараты, якія з'яўляюцца ўльтрафіялетавымі фільтрамі і ўтвараюць на паверхні скуры шчыльную плёнку. Як жа выкарыстоўваць такія крэмы, ласьёны, спрэі?

Сродкі з высокай ступенню аховы прымяняюць у першыя дні знаходжання на пляжах, калі скура не выпрацавала яшчэ натуральнай аховы супраць ультрафіялетавых промняў. Гэтыя сродкі патрэбны ўладальнікам светлай, адчувальнай скуры, у тым ліку з вяснушкамі, якая дрэнна загарае і хутка чырванее.

Сродкі з высокай ступенню аховы можна выкарыстоўваць для асобных, найбольш адчувальных участкаў (плечы, нос, грудзі) або ў тым выпадку, калі неабходна поўнасцю засцерагчы скуру ад загару.

Сродкі з сярэдняй і нізкай ступенню аховы выкарыстоўваюць у сярэдняй паласе або для скуры, якая ўжо адаптавалася да паўднёвага сонца. Імі можна карыстацца пачынаючы з пятага дня знаходжання на пляжы.

Скурааховыя сродкі для інтэнсіўнага загару прызначаныя для смуглай скуры або для той, якая ўжо добра загарэла. Яны валодаюць мінімальнай аховай і выкарыстоўваюцца ў асноўным для ўвільгатнення і змякчэння, а таксама для забеспячэння роўнага, прыгожага і інтэнсіўнага загару.

У выглядзе алоўкаў, памад або крэмаў выпускаюцца спецыяльныя сродкі для аховы найбольш адчувальных участкаў скуры (вуснаў, носу, вушэй). Гэтыя прэпараты маюць невялікі аб'ём , а таму іх вельмі зручна насіць у сумачцы, каб заўсёды мець пад рукой.

Пад адкрытым пякучым сонцам скура адчувае вельмі моцны стрэс, а значыць мае патрэбу ў абавязковым аднаўленні. Для гэтага выкарыстоўваюцца разнастайныя сродкі для загару, якія ўтрымліваюць вітамін Е , алеі, раслінныя экстракты.

Няправільна выкарыстаны сонцаахоўны крэм будзе малаэфектыўным. Звычайна на цела наносяць недастаткова сродку — ад 25 да 75 % ад неабходнай колькасці.

Такім чынам, каб правільна нанесці крэм, трэба:

==> Раздзяліць усю паверхню цела на 11 участкаў, кожны з якіх складае 9 % ад агульнай паверхні. На першы погляд здаецца, што выканаць гэта немагчыма, але насамрэч усё даволі проста — гэта рукі, ногі, паверхня грудзей, жывата і спіны, вобласць шыі і галавы;

==> На паверхню складзеных разам указальнага і сярэдняга пальцаў трэба нанесці дзве палоскі крэму з тубы (па адной палосцы на кожны палец) — гэтага дастаткова для адной зоны. Аднак варта памятаць, што такой колькасці шмат для аднаразовага прымянення, таму лепш наносіць спачатку палову, а астатняе — хвілін праз 30.

І ўсё ж з сонцаахоўным сродкам або без яго да сонца трэба ставіцца з асцярогай. Пашкоджанне скуры пачынаецца з таго моманту, калі на яе трапляюць сонечныя промні. Таму трэба пазбягаць сонца, калі яно знаходзіцца высока ў небе, і абмежаваць час знаходжання на ім.

**Падрыхтавала Вольга ШАЎКО.**

### АЎСТРАЛІЙСКІЯ ЎРАЧЫ ПАЧАЛІ ШТРАФАВАЦЬ ПАЦЫЕНТАЎ ЗА СПАЗНЕННЕ

Аўстралійскія ўрачы агульнай практыкі пачалі штрафаваць пацыентаў за спазненне на прыём, паведамляе Herald Sun.

Памеры штрафу за дзесяціхвіліннае спазненне ў некаторых клініках даходзяць да 50 аўстралійскіх долараў (каля 43 долараў ЗША).

Арганізацыі, якія абараняюць правы пацыентаў, бачаць у падобных дзеяннях двайныя стандарты: урачы, якія выбіваюцца з графіка, не плацяць пацыентам за чаканне прыёму.

ФОНД «ГРОДНООБЛИМУЩЕСТВО»
15 июля 2010 года в 11 часов 30 минут
ПРОВОДИТ АУКЦИОН С УСЛОВИЯМИ
по продаже объектов, находящихся в собственности Гродненской области, и права заключения договоров аренды земельных участков:

1. Здания Дома быта и права заключения договора аренды земельного участка площадью 0,0383 га, расположенного в г.п. Кореличи по ул. 1 Мая, 2. Начальная цена продажи предмета аукциона 307 047 917 рублей.

2. Здания специализированного для бытового обслуживания населения и права заключения договора аренды земельного участка площадью 0,1733 га, расположенного в г.п. Мир по ул. Первомайской, 13. Начальная цена продажи предмета аукциона 83 258 908 рублей.

3. Административно-хозяйственного здания Новогрудского КБО и права заключения договора аренды земельного участка площадью 0,0760 га, расположенного в г. Новогрудок по ул. Ленина, 4. Начальная цена продажи предмета аукциона 263 653 850 рублей.

4. Комплекса зданий, сооружений, оборудования ДП «Свислочская МПМК-162» и права заключения договора аренды земельного участка площадью 1,4139 га, расположенных в г. Свислочь по ул. Комсомольской, 45/3. Начальная цена продажи предмета аукциона 1 556 990 691 рубль.

5. Зданий склада ГСМ, хранилища, сооружений ДП «Свислочская МПМК-162» и права заключения договора аренды земельного участка площадью 0,0526 га, расположенных в г. Свислочь по ул. Комсомольской, 45/1. Начальная цена продажи предмета аукциона 45 012 935 рублей.

По вопросам участия в аукционе обращаться по тел.: 77 29 15, 72 25 18.

Сам сабе псіхолаг

# ДАЙЦЕ ГРОШАЙ!

**Як павысіць сабе заробак? Нават яшчэ складаней — як дабіцца павышэння заработнай платы ва ўмовах крызісу? Гэта, безумоўна, няпроста, але — сцвярджаюць спецыялісты — магчыма!**

### Просім на справу

Бадай, самае галоўнае — падабраць правільную аргументацыю. У кампаніі ацэньваецца ўзровень адказнасці і прафесіяналізм. Калі хочаце павысіць сабе заробак, заявіце пра гатоўнасць стаць на самы складаны ўчастак работы, узяць на сябе дадатковыя функцыі, якіх пазбягаюць больш пасіўныя калегі. Тады вы гаворыце са сваім начальнікам на адной мове — мове прыбыткаў і выгод для кампаніі. Чаго босы зусім не пераносяць, дык гэта неаргументаванага «іншыя атрымліваюць больш». Але мацней за ўсё іх раздражняе заява: «мне павысілі арэндную плату за кватэру, падыміце ж заробак!». Таму што так дзелавая размова пераносіцца на бытавое поле, і замест прывычнага для шэфа амплуа кампетэнтнай супрацоўніцы вы прапануеце яму бачыць вас у ролі дармаеда.

### Не трэба страхаў

Не бойцеся пачынаць размову. Апытанні паказваюць, што большасць начальнікаў добра разумеюць жаданне супрацоўнікаў атрымліваць больш. Але гэта не значыць, што яны гатовыя па ўласнай ініцыятыве падняць вам зарплату. Калі чалавек сядзіць у офісе з васьмі да васьмі, не ідзе ў водпуск, затое бярэ работу дадому на выхадныя і пры гэтым згодзен атрымліваць мільён рублёў, што ж, гэта выгадны набытак для кампаніі, які дазваляе скараціць выдаткі. «Калі б ён «каштаваў» больш, то абавязкова заявіў бы пра гэта», — супакойвае сябе бос. І, як ні дзіўна, ён мае рацыю.

### Ацані сябе сам

Дарэмна разлічваць на павелічэнне зарплаты, не павысіўшы ўласную самаацэнку. Размова пра грошы для большасці людзей — напружанне. Калі начальнік пачуе, што вы няўпэўненым тонам вымаўляеце самыя правільныя словы, якім, магчыма, навучыліся на трэнінгу па жорсткіх перамовах, ён не ўпусціць магчымасці «паставіць на месца» супрацоўніка, які зарваўся.

Няўмольны псіхалагічны закон гаворыць: калі ўнутрана вы лічыце, што не «каштуеце» больш чым мільён рублёў у месяц, то ніколі не зможаце атрымліваць нават паўтара... Выйсце адно: працаваць з самаацэнкай, магчыма, з дапамогай прафесіянала — псіхолага, бізнэс-кансультанта. Бо, урэшце, упэўненасць у сабе — гэта тавар, які выдатна прадаецца.

### Палічым

Ці ўплываюць на ваш заробак аб'ектыўныя паказчыкі? Практыка паказвае, што на начальства робіць уражанне толькі прамая выгада для бізнэсу. Інакш кажучы, «дзякуючы мне вашы даходы павысіліся на 20 %, таму падніміце мне заробак на 10 %» — дзейнічае, а «я вывучыла японскую і закончыла МВА (адукацыйная праграма, створаная па міжнародных стандартах, для ўладальнікаў бізнэсу і топ-менеджараў кампаній)» — ужо не. Логіка дырэктара простая: вось калі ад твайго МВА будуць дывідэнды, тады пагаворым, а пакуль гэта — твая асабістая справа. Аднак у рэальнасці пашырэнне прафесійнай адукацыі заўсёды акупляецца з лішкам. Па-першае, на менеджарскіх курсах слухачоў вучаць якраз павышаць самаацэнку і эфектыўнасць самапродажу. Па-другое, у будучага боса ўсе курсы і трэнінгі выклікаюць спрыяльнае ўражанне: яму ж ужо не давядзецца плаціць за ваш МВА са сваёй кішэні, і, акрамя таго, паказваюць, што вы ініцыятыўныя, нацэленыя на кар'еру. Безумоўна, гэтыя моманты вартыя матэрыяльнага заахвочвання.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

| НІКОЛІ | ЗАМЕСТ ГЭТАГА |
| --- | --- |
| ● **Не апелюйце да эмоцый і пачуцця справядлівасці.** Аргументы «я адна за ўсіх пашу!», «за такія грошы толькі дурань працаваць будзе» — не дзейнічаюць. | ● Пакажыце канкрэтныя лічбы, якія неабвержна даказваюць, што ў выніку вашай дзейнасці павысіліся даходы / скараціліся выдаткі кампаніі, або аб'ём вашай работы істотна вырас. |
| ● **Не шантажыруйце.** На «калі не павысіце мне заробак, я адразу звольнюся» адказам будзе, хутчэй за ўсё, «да пабачэння». Асабліва сумна, што на ваша месца цалкам могуць узяць супрацоўніка з тым самым заробкам, які патрабавалі вы, паколькі астатнія вашы аргументы пастфактум пераканалі боса. | ● Падкрэсліце, што любіце сваю работу, што вам вельмі прыемны калектыў (не варта напіраць на момант асабістай адданасці босу, такі падхалімаж выкліча супрацьлеглы эфект), што ў вас ёсць нямала ідэй, як забяспечыць працвітанне кампаніі — вось толькі нядрэнна было б павялічыць і даход... |
| ● **Не адказвайце на прамое пытанне начальніка «колькі вам трэба?» сціплым «ну, колькі зможаце; не ведаю».** Так вы лёгка заробіце зневажальную «прыбаўку» ў 50 тысяч і істотна ўскладніце новую размову пра павышэнне акладу. Дарэчы, бос цудоўна ведае, што гэтым пытаннем можа вас збянтэжыць і прымусіць збіць цану, таму з задавальненнем яго задасць. | ● Ідучы на размову пра павышэнне заробку, трэба дакладна ўяўляць, колькі менавіта вы хочаце атрымліваць. І майце на ўвазе, што бос рэдка дае супрацоўніку роўна такую суму, якую той просіць, таму прасіце крыху больш, каб у выніку торгу спыніцца якраз на жаданай суме. |
| ● **Не пагаджайцеся працаваць за тыя грошы, якія лічыце цалкам не адпаведнымі вашаму сапраўднаму «кошту».** | ● Прадоўжыце адначасова пошукі і самаўдасканальванне. Бо мы атрымліваем тую зарплату, якую здольныя сабе забяспечыць. |

Якасць жыцця

# ЗНАЁМЦЕСЯ — ЦЫНК

**Яшчэ старажытныя егіпцяне валодалі сакрэтамі прыгатавання лекаў, якія хутка загойвалі раны. І гэтыя лекі ў сваёй аснове мелі... цынк. Прыгажосць мужчын таксама шмат чым павінна быць удзячная цынку. Давайце пазнаёмімся з гэтым цікавым кампанентам нашага арганізма.**

### ТАКІ НЕАБХОДНЫ ЦЫНК

Пра тое, што нам неабходны цынк, мы даведаліся не так даўно, хоць цынкавай маззю лячылі раны яшчэ ў часы фараонаў, а можа і раней. Аднак цяпер мы ведаем пра цынк значна больш. Гэты элемент знойдзены ва ўсіх клетках і органах чалавечага арганізма. Больш за ўсё яго ў эндакрынных залозах — гіпофізе і падстраўнікавай залозе, сятчатцы вока, а таксама ў мужчынскіх палавых залозах, асабліва ў іх сакрэце.

Паступаючы ў арганізм чалавека, цынк усмоктваецца ў тонкім кішэчніку, пасля гэтага трапляе ў печань, а адтуль — ва ўсе неабходныя органы. Будучы звязаным з ферментамі, гармонамі і вітамінамі, ён ажыццяўляе значны ўплыў на асноўныя жыццёвыя працэсы: крывятварэнне, размнажэнне, рост і развіццё арганізма, абмен бялкоў, тлушчаў і вугляводаў.

Вядома, што цынк, стымулюючы гарманальную дзейнасць гіпофіза, садзейнічае росту арганізма і павелічэнню яго вагі. Адпаведна, недастатковасць гэтага мікраэлементу прыводзіць да затрымкі росту і зніжэння масы цела. У жыхароў некаторых краін Сярэдняга Усходу, часткі раёнаў Егіпта, прадукты харчавання якіх бедныя на цынк, часта назіраецца карлікавасць. Колькасць цынку ў арганізме таксама ўплывае на рост пазногцяў і валасоў, стан скурных покрываў. Не выключана, што аблысенне мужчын у сталым узросце абумоўлена дэфіцытам у іх арганізме менавіта цынку.

Важная роля гэтага мікраэлементу ў функцыі мужчынскіх палавых органаў. Цынк садзейнічае сакрэцыі фалікуластымулюючага (таго, які актывізуе ўтварэнне сперматазоідаў у семявых канальцах) і лютэінізуючага (адказнага за выпрацоўку тэстастэрону) гармонаў. Гэта значыць, ён актыўна ўплывае на рэпрадукцыйную функцыю мужчын, а дэфіцыт гэтага элементу можа прывесці да парушэння прадукцыі спермы і нават да палавой стэрыльнасці. Таму прэпараты цынку выкарыстоўваюць у якасці першай дапамогі пры мужчынскай бясплоднасці.

У падлеткавым узросце недахоп цынку прыводзіць да непаўнацэннага развіцця палавой сістэмы, паколькі цынк уваходзіць у склад ферментаў, што ўдзельнічаюць у сінтэзе палавых гармонаў. У сваю чаргу, гэта вядзе да шэрагу гарманальных парушэнняў як у дзяўчат (дысфункцыя яечнікаў і г.д.), так і ў хлопчыкаў (прыкметы інфантылізму, дрэннае развіццё прастаты).

А нядаўна вучоныя зрабілі адкрыццё: цынк — сапраўдны мінерал цвярозасці! Высветлілася, што ён уваходзіць у склад асобага ферменту — алкагольдэгідрагеназы, які адказвае за расшчапленне спірту і папярэджвае ап'яненне. Калі арганізм забяспечаны дзённай нормай цынку, эфектыўнасць дзеяння ферменту павялічваецца, а пагроза развіцця алкагалізму змяншаецца.

### Суперцынкавы абед

- Салата з адварнога рысу з морапрадуктамі.
- Сачавічная поліўка з баранінай.
- Цялячая пячонка, абсмажаная на цыбульнай падушцы, з зялёным гарошкам.
- Жэле з лясных ягадаў, гарбузовыя семкі.

Выяўлена таксама сувязь паміж недастатковасцю цынку ў ежы і загойваннем ран. У хворых з цяжкімі ранамі канечнасцяў назіралася змяншэнне колькасці цынку ў крыві. Дадатковае ўвядзенне ў харчовы рацыён цынку садзейнічала хуткаму загойванню ран.

### ВОРАГІ ЦЫНКУ

Малочныя прадукты зніжаюць засваяльнасць цынку, а кафеін і алкаголь узмоцнена выводзяць яго з арганізма. Утрыманне цынку зніжаецца пры прыёме аральных кантрацэптываў. Кортыкастэроіды, якія прызначаюцца ўрачом пры шэрагу захворванняў (артрыт і інш.), таксама зніжаюць узровень цынку. Дабаўкі кальцыю, якія часта прапісваюць цяжарным і пажылым, змяншаюць засваенне цынку амаль на 50 %.

Цынк узмоцнена выводзіцца з арганізма пры стрэсе, а таксама пад уздзеяннем цяжкіх металаў і іншых забруджвальнікаў. Галодныя і незбалансаваныя дыеты таксама адмоўна ўплываюць на яго запасы.

### КАЛІ ЦЫНКУ НЕДАСТАТКОВА

Найбольш раннімі сімптомамі недастатковасці цынку могуць быць апатыя і дэпрэсія. Апісаны выпадкі цяжкай дэпрэсіі (спробы самагубства ў групе дарослых людзей, хворых на вірусны гепатыт), якія суправаджаліся дэфіцытам цынку.

Парушэнне абмену гэтага элементу таксама можа праяўляцца паніжэннем або скажэннем смаку і нюху. Даказаны актыўны ўдзел цынку ў абмене вітаміну А (рэтынолу), які павінен пастаянна паступаць у сятчатку вока для ўтварэння зрокавага пігменту і папярэджання «курынай слепаты».

Лабараторна вызначана, што недастатковасць цынку можа выклікаць прыроджаныя парокі развіцця органаў і сістэм, асабліва цэнтральнай нервовай сістэмы і лёгкіх.

Сутачная патрэбнасць яго ў арганізме дарослага складае каля 0,2 мг/кг масы, а падлетка, які расце, — не менш за 0,3 мг на 1 кг масы цела.

### ВЫСЕЎКІ, ВУСТРЫЦЫ І ГРЫБЫ

Больш за ўсё цынку ўтрымліваюць вустрыцы (каля 270 мг/кг). За імі ідуць высеўкі, прарослае зерне пшаніцы (130—202 мг/кг). У грыбах утрымліваецца 75—140 мг/кг цынку, у рыбе і ялавічнай печані на 1 кг прыпадае ад 30 да 85 мг гэтага мікраэлементу, а ў пшанічнай муцэ, сачавіцы, сушаных дражджах — ад 20 да 50 мг/кг.

Пры развіцці недастатковасці цынку рэкамендуецца ўжываць такія прадукты, як пшанічныя крупы, буракі, цыбуля, зяленіва, мяса (ялавічына, птушка), курыныя яйкі і інш.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

## ЛЕКІ ДЛЯ ЖЫВЁЛ І ЛЮДЗЕЙ

Ідзе рэканструкцыя «Віцебскай біяфабрыкі» ў вёсцы Доўжа. Для гэтага з дзяржаўнага бюджэту накіравана больш за 191 мільярд рублёў. У выніку на гэтым унікальным у Саюзе незалежных дзяржаў прадпрыемстве цяпер ёсць магчымасць не толькі вырабляць ветэрынарныя прэпараты і лекі, каб не купляць для патрэб краіны аналагічныя за мяжой, але і рыхтуюцца канкурыраваць з вядучымі замежнымі вытворцамі. Цана прадукцыі прадпрыемства значна ніжэйшая, чым той, што зараз экспартуецца ў Беларусь. Гэта дазволіць зэканоміць краіне штогод мільярды рублёў. Больш за тое, на прадпрыемстве могуць вырабляць і лекі для людзей.

Праект павінен акупіцца за чатыры-пяць гадоў. Галоўная найбліжэйшая задача — атрыманне адпаведнай атэстацыі для выхаду на еўрапейскі рынак. І для гэтага ёсць усе падставы. Нашы кантрольныя прэпараты, якія будуць тут вырабляцца, атрымалі ўжо самы высокія ацэнкі якасці ў Турцыі.

Экспарт таксама ідзе ў Казахстан і Расію. Паводле слоў дырэктара прадпрыемства Аркадзя Юдасіна, зараз на прадпрыемстве працуе каля 230 чалавек. І гэта пры ўсім тым, што насельніцтва вёскі Доўжа каля тысячы. Каб забяспечыць жыллём спецыялістаў, пабудаваны жылы дом, узводзяцца яшчэ некалькі. Сярэдні заробак за пяць месяцаў бягучага года склаў 835 тысяч рублёў. Штогод тут зарплата павялічваецца, як і чысты прыбытак. Фабрыка ў правінцыі па-свойму ўнікальная тым, што тут наладжана цеснае ўзаемадзеянне з ВНУ. Будучыя медыкі, біёлагі могуць засвойваць перадавыя тэхналогіі. Плённае супрацоўніцтва вядзецца і з Нацыянальнай акадэміяй навук. Вучоныя могуць распрацоўваць вакцыны і гэтак далей, якія будуць укараняцца ў вытворчасць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*Пасёлак Доўжа Віцебскага раёна.*

Усходні гараскоп на наступны тыдзень



# Цяльцам давядзецца змагацца з лянотай, а ў Ільвоў будзе магчымасць праявіць свае лепшыя якасці

**АВЕН**. Выразна сфармулюйце, чаго вы хочаце, і спакойна плывіце па цячэнні. Усё пастуопва само адбудзецца менавіта так, як вам трэба. Сціпласць будзе годным упрыгожваннем — не забывайцеся пра гэта, і тады маса магчымых непаразуменняў, няёмкасцяў і нават канфліктных сітуацый абыдзе вас бокам. Але не захапляйцеся: свае правы ўсё ж можна і трэба адстойваць, галоўнае — знайдзіце дзейсныя аргументы.

**ЦЯЛЕЦ**. Вашы сумненні і ваганні падвядуць да думкі пра неабходнасць выбару. Паспрабуйце раскрыць свой творчы патэнцыял. Трэба навучыцца больш настойліва адстойваць свае планы і задумы. Калі ў вас не паўстане пачуццё ўнутранага пратэсту, то пажадана не адмаўляцца ад далёкіх камандзіровак. Не раздражняйцеся па дробязях, а ўпарта імкніцеся да вызначанай мэты — тады адчуеце, што ў вас выдатны настрой, плечы выпрамляюцца самі па сабе, а заадно прасвятляюцца гарызонты. Сяброўская вечарынка ў нядзелю развее астаткі журботных думак.

**БЛІЗНЯТЫ**. Верагодныя пэўныя рознагалоссі з партнёрамі. Пераадолеўшы іх, можаце атрымаць перспектыўныя прапановы ў бізнэсе. Некаторыя праблемы могуць запатрабаваць неадкладнага вырашэння, і гэта прымусіць задумацца над сітуацыяй, якая склалася. Калі раптам вы задумалі змяніць месца жыхарства, паспрабуйце не спяшацца з рэалізацыяй гэтай думкі, прынамсі, да наступнага тыдня. Вам могуць нагадаць пра абавязкі, у тым ліку і маральныя. Не прымушайце нагадваць двойчы. Нядзеля можа падарыць незабыўныя прыгоды.

**РАК**. Маленькія цяжкасці лёгка адступяць пад вашым націскам, а больш сур'ёзныя толькі разахвоцяць ваш баявы запал. Не выпусціце імгненне поспеху — у аўторак чыясьці рэкамендацыя можа сур'ёзна палепшыць ваша становішча, калі, вядома, вы загадзя да гэтага падрыхтуецеся і не сапсуеце ўсё ўласнай нерашучасцю. У сераду настрой будзе ў найвышэйшай ступені зменлівы. Мэта, якую вы паставіце перад сабой у пятніцу, можа запатрабаваць асабістай дысцыпліны і самаадачы, але вынік перасягне ўсе чаканні.

**ЛЕЎ**. Размяшчэнне зорак дасць магчымасць праявіць свае лепшыя якасці. У аўторак могуць з'явіцца праблемы на працы з-за рознагалосся з начальствам. Хто б ні меў рацыю, пачынаць па гэтай падставе адкрытыя баявыя дзеянні не рэкамендуецца. Паспрабуйце яшчэ ў пачатку тыдня завяршыць пачатыя справы і не браць на сябе новых абавязкаў. Кантралюйце эмоцыі — у запале можаце нагаварыць чагосьці, пра што потым будзеце доўга шкадаваць. Менш хвалюйцеся, больш верце ў свае сілы.

**ДЗЕВА**. Добры час для рашэння пытанняў, якія да гэтага выклікалі пэўныя цяжкасці. Спрыяльны перыяд таксама і для прыняцця адказных рашэнняў. Новыя падзеі, якія адбудуцца на працы, адцягнуць вас ад журботных думак і падораць зарад аптымізму. Падумайце аб павышэнні свайго прафесійнага ўзроўню. Прыміце запрашэнне старых сяброў, яно вельмі важнае для вас.

**ШАЛІ**. Можа падацца, што вы заблыталіся ў сітуацыі, якая склалася. Вам неабходныя спакой і цішыня, каб ва ўсім разабрацца. Не адмаўляйцеся ад староннняй дапамогі, бо вашы сілы і магчымасці не бязмежныя. Паспрабуйце не даваць падстаў для сваркі блізкім людзям. Найболей спрыяльным днём для вас будзе чацвер.

**СКАРПІЁН**. Можа з'явіцца шанц прасунуцца па кар'ернай лесвіцы. У вас з'явіцца нямала спосабаў дамагчыся жаданага — было б чаго жадаць. У панядзелак многае можна будзе атрымаць дзякуючы сваёй працы. У аўторак непажадана сварыцца і канфліктаваць, у гэты дзень лепш не рэагаваць на выбрыкі нядобразычліўцаў. У нядзелю варта адпачыць далей ад дома, пажадана змяніць становішча як мага больш кардынальна.

**СТРАЛЕЦ**. Будзьце больш прадбачлівымі, трымайце сябе ў руках — і тады не давядзецца раскайвацца ў сваіх учынках. Можа паступаць цікавая і своечасовая інфармацыя, вельмі важна правільна ёй распарадзіцца. Паспрабуйце не трапляцца на вуду і не верыць ілюзіям, тады ваша паспяховасць узрасце і на працы. Складзецца спрыяльная сітуацыя для далейшага прасоўвання па кар'ернай лесвіцы. Заблытаныя адносіны са сваякамі перастануць хваляваць. У нядзелю адпачніце ад хатніх клопатаў.

**КАЗЯРОГ**. Усё ідзе ўдала, калі не лічыць адной зусім малаважнай, але вельмі непрыемнай штукі, і імя ёй — лянота. Калі пераадолееце яе, то ўсё будзе выдатна. Прапаноўвайце свае ідэі, планы і праекты — яны рэалістычныя, а значыць, хутка ўвасобяцца ў жыццё. Адкрыйце для сябе нешта новае, і адчуеце, што ў чымсьці сталі мудрэйшымі. У выхадныя пастарайцеся добра адпачнуць.

**ВАДАЛЕЙ**. Тыдзень асабліва добры для творчасці ў любых яе праявах. Зможаце значна змяніць свет вакол сябе, калі захочаце гэтым займацца. Найболей практычнае выкарыстанне дадзенага таленту, мабыць, знойдуць тыя, хто зоймецца рамонтам жылля. У панядзелак і аўторак давядзецца задумацца аб тым, што рабіць з тым становішчам, якога вы дасягнулі. Можаце прыйсці да разумення, што выкарыстоўваеце далёка не ўсе ўласныя магчымасці.

**РЫБЫ**. Праца не запатрабуе звышнамаганняў, а значыць, у вас з'явіцца магчымасць часцей бываць дома. Зможаце пераканацца ў адданасці тых, каго вы любіце. У панядзелак планы могуць змяніцца пад уплывам вонкавых абставінаў. У аўторак складзецца спрыяльная сітуацыя для таго, каб вырашыць старыя праблемы і расправіцца з бюракратычнай цяганінай. У чацвер пажадана быць максімальна законапаслухмянымі — самае нязначнае парушэнне будзе заўважана і пакарана, і ніякія апраўданні не дапамогуць. У нядзелю ад вашага настрою будзе залежаць настрой навакольных.

Аўтасэрвіс

# ГОРАЧА БЫВАЕ ЎСІМ

## Аўтамабілістам у спякоту трэба падбаць не толькі пра сябе, але і пра сваю машыну

**КАЛІ пасля мыйкі вы будзеце пакрываць кузаў паліроллю, то лакафарбавае пакрыццё не будзе выліньваць ад ультрафіялетавых прамянёў. Паліроль абараняе не толькі ад сонечнага ўздзеяння, але і ад дробных драпін.**

Калі вы ў багажніку возіце каністру з бензінам, то не забудзьцеся, што ні ў якім разе нельга запраўляць запасную каністру «пад завязку» — бензіну павінна быць максімум 4/5 ад поўнага аб'ёму самой каністры. Інакш у спякоту ў зачыненым багажніку гаручае расшыраецца, таму што бензін мае высокі каэфіцыент расшырэння. І ў выніку дастаткова будзе нават маленькай іскры для таго, каб атрымаўся немаленькі выбух.



Зразумела, што аўтааматары ў спякоту імкнуцца паставіць машыну ў цень. Але пастрайцеся не ставіць машыну пад дрэвам, бо птушыны памёт утрымлівае шчолач, якая можа сапсаваць фарбу кузава. Калі ўсё ж непрыемнасць адбылася, то птушыныя «сляды» варта прыбраць адразу, бо пазбавіцца ад засохлых слядоў будзе значна складаней.

Калі вы пакінулі аўтамабіль пад ліпай, то ведайце, што з гэтага дрэва ў гарачае надвор'е выдзяляецца нешта падобнае на сіроп. Гэта не ліпавы сок — гэта экскрыменты ліпавай тлі. Пазбавіцца ад іх нескладана, але чысты выгляд машына страціць.

Падчас спякотнага сезона гума і паветра ўсярэдзіне яе награваюцца, да таго ж шыны як бы «чыркаюць» аб голы асфальт. З-за гэтага ціск у шынах павышаецца і ўзнікае небяспека выбуху пакрышак. Раз на 2-3 тыдні правярайце ціск манометрам.

Ніколі не ўключайце кандыцыянер на поўную магутнасць адразу ж, як сядзеце ў аўтамабіль, бо ў машыне, якая вельмі нагрэлася, ад перападу тэмператур, шкло можа даць расколіну. Спачатку хоць бы на хвіліну адкрыйце ўсе вокны і правертрыце салон, а ўжо затым уключайце кандыцыянер на вялікую магутнасць і накіроўвайце паветра ў салон (праз цэнтральныя і бакавыя дэфлектары). Калі праз 2-3 хвіліны паветра стане халодным, можна будзе пераверсці вентылятар на малыя абароты.

Будзьце асцярожныя з выкарыстаннем кандыцыянера ў заторах і пры інтэнсіўным руху ў горадзе, бо ён дае дадатковую нагрузку на рухавік, што можа стаць прычынай перагрэву матора. Часцей пазірайце на датчык тэмпературы астуджальнай вадкасці: калі стрэлка набліжаецца да чырвонай адзнакі (130 градусаў), неадкладна выключайце кандыцыянер. Рамонт даражэй за камфорт.

У гарачае надвор'е не пакідайце хатніх жывёл у салоне аўтамабіля, нават калі вы плануеце на некалькі хвілін забегчы ў краму. Неспадзяваныя акалічнасці могуць прымусіць вас затрымацца даўжэй, а ваш хатні гадаванец у зачыненай машыне можа не перажыць духату і высокую тэмпературу. І , вядома, нельга пакідаць у машыне маленькіх дзяцей. Здавалася б усе пра гэта ведаюць, але, тым не менш, менавіта па гэтай прычыне здараюцца страшныя трагедыі.

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

КУХОННЫЯ ПАМОЧНІКІ

## Які чарпак выбраць?

**Набор кухонных прыбораў — апалонік, шумоўка, лапатачка, вялікі відэлец і сервіравальная лыжка, напэўна, прысутнічае на кухні кожнай гаспадыні. Яны могуць быць драўляныя, жалезныя, пластыкавыя і інш. Які ж матэрыял найболей даўгавечны і зручны ў выкарыстанні?**



***Калі вы карыстаецеся драўлянымі прыборамі...***

Дрэва, з якога зробленыя кухонныя прыборы, павінна быць цвёрдых парод — бук, дуб. Да мяккіх адносяцца асіна, клён, вішня. Вырабы з іх хутка зношваюцца — лапатачкі кудлацяцца, трэскаюцца і набракаюць ад вады, на іх з'яўляюцца шчарбіны, што робіць іх нязручнымі ў выкарыстанні. Акрамя таго, яловыя прыборы вельмі духмяныя і аддаюць свой пах ежы, што, вядома, непажадана. А драўляныя ручкі нажоў, з якога б дрэва ні былі зробленыя, усё адно актыўна ўбіраюць пах. І, вядома, калі вы пакінеце на патэльні разам з ежай , якую разаграваеце, лапатачку і зазяваецеся, ад яе нічога не застанецца.

***Калі вы карыстаецеся пластыкавымі прыборамі...***

Вядомая фірма, якая «заўсёды думае пра нас», выпускае да сваіх суперпатэльняў яшчэ і добрыя наборы сталовых прыбораў. Яны вельмі зручныя ў выкарыстанні — патэльні не драпаюць, мыюцца лёгка, служаць доўга. Але трэба абавязкова звярнуць увагу на тое, што кухонныя вырабы з пластыку павінны быць цёмнага колеру. Светлыя пластмасы пры тэрмічнай апрацоўцы вылучаюць шкодныя рэчывы.

***Калі вы* карыстаецеся *металічнымі прыборамі...***

Вырабы з нержавейкі не патрабуюць адмысловага догляду і доўга служаць на кухні. Ёсць варыянты — з пластыкавай ручкай, якая можа адшчапіцца, абплавіцца, або суцэльнаметалічныя, у якіх ручка награваецца і не заўсёды зручная ў выкарыстанні. Вырашайце.

Самыя даўгавечныя прыборы — з латуні. Вось толькі вельмі дарагія.

КАРЫСНА ВЕДАЦЬ

## Захаваем вітаміны ў агародніне і садавіне



**Пры цеплавой апрацоўцы садавіна і агародніна губляюць большасць карысных рэчываў, якія змяшчаюцца ў іх. Аднак не толькі варэнне або смажанне вінаватыя ў страце вітамінаў. Вось некалькі простых правілаў, выканне якіх дапаможа захаваць жыватворныя сілы садавіны і агародніны.**

1. Садавіну і агародніну трэба чысціць непасрэдна перад кулінарнай апрацоўкай. Пакідаць іх у халоднай вадзе можна не больш чым на 5 хвілін!

2. Па магчымасці, рэзаць садавіну і агародніну трэба не вельмі дробна, бо ў гэтым выпадку меншая паверхня, якая падвяргаецца акісленню з-за сутыкнення з нажом, і меншая страта пажыўных рэчываў.

3. Надзёртую або нарэзаную агародніну добра апырскваць лімонным сокам — кіслата палепшыць засваяльнасць шматлікіх вітамінаў і мікраэлементаў.

4. Па магчымасці, не зразайце лупіну: клятчатка і шматлікія пажыўныя рэчывы знаходзяцца непасрэдна пад ёй.

5. Булён з агародніны добра выкарыстоўваць для прыгатавання супоў і падлівак, бо ў ім застаюцца мінералы, якія выдзеліліся пры варцы.

-2666-

ПРЫГАЖОСЦЬ У ДОМЕ

## Кветкі — гэта заўсёды радасць!

**Прыемна, калі ў чыста прыбраным доме стаяць букеты ў вазах. Зусім не абавязкова, каб кветкі былі дарагімі і раскошнымі, галоўнае, каб кампазіцыя была складзеная з густам.**



Каб кветкі прастаялі даўжэй, напоўніце вазу вадой (пажадана пакаёвай тэмпературы). Затым дадайце спецыяльны састаў, які ачышчае ваду. Калі такога саставу ў вас няма, замяніце яго аспірынам, кавалачкам камфары або драўнянага вугалю альбо лыжкай бікарбанату соды або солі. У наступныя дні не трэба будзе замяняць усю ваду, дастаткова даліваць ваду той жа тэмпературы, а праз некалькі дзён дадайце яшчэ трохі саставу, які падаўжае жыццё кветак. Поўнасцю ачысціце ножкі, якія будуць пагружанымі, ад лісця, бо яно загнівае і выклікае забруджванне вады, што вядзе да хуткага завядання кветак. Злёгку расплюшчыце дравяністыя сцёблы або зніміце з іх кару і надрэжце іх на даўжыню прыкладна 5 см перад апусканнем у ваду.

Ножкі, якія вылучаюць малочны сок, трэба хутка абпаліць на агні, каб спыніць выдзяленне латэксу.

Сцёблы гваздзікоў трэба абрэзаць пад вузлаватай часткай.

Цалкам ачысціце сцёблы ружаў ад шыпоў.

Кветкі надоўга захаваюць свежасць толькі ў тым выпадку, калі забяспечыць ім шмат вады для піцця, таму размяшчайце іх у вазах свабодна і не сціскайце сцёблы.

Высокія і вузкія вазы падыходзяць для кветак з прамым і доўгім сцяблом, а нізкія і шырокія — для кароткіх, а таксама для круглых і конусападобных кампазіцый.

Шкло і крышталь ідэальныя для кветак любой афарбоўкі. Фарфор, драўніну, медзь больш складана прыстасаваць да спалучэння красак, але затое пры ўдалым рашэнні эфект бывае ўзрушальным.



Нават самы сціплы маленькі букецік або невялікая зялёная галінка змогуць упрыгожыць святочны стол. Толькі памятайце, што высокі букет ставіцца не на сярэдзіну стала, а збоку. Затое маленькіх букецікаў можа быць некалькі, і ставіць іх лепш па цэнтры. Кветкі ставяць на стол у нізкім посудзе так, каб госці маглі бачыць адно аднаго.

ЗАНАТУЙЦЕ

- Каб рукі не пахлі цыбуляй, пратрыце іх рэзаным зяленівам пятрушкі. Каб рукі не пахлі часнаком, пратрыце іх рэзаным зяленівам сельдэрэю.
- Не выкідвайце лімонную скурку — калі пакладзяце яе ў ваду для мыцця, посуд, асабліва шкляны, набудзе бляск.
- Зняць налёт ад кавы і чаю можна, калі працерці кубачак сталовым воцатам ці моцным растворам кухоннай солі.
- Каб выдаліць з вазы для кветак белыя палосы, якія часам застаюцца на сценках, дадайце ў ваду для мыцця крыху воцату.
- Калі малако збегла, накрыйце залітую ім паверхню пліты газетай. Гэта не дасць распаўсюдзіцца непрыемнаму паху па ўсім памяшканні.
- Посуд з-пад малочных прадуктаў, цеста, яек трэба мыць толькі халоднай вадой, бо ад гарачай вады бялок звернецца і моцна прыстане да паверхні.

Мыццё тлустых талерак можа значна палегчыць звычка не ставіць іх у стопку.

-2667-

## 3 ліпеня

Дзве даты

**1410 год** — аб'яднанае войска Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы адправілася ў паход супраць тэўтонскага ордэна. 12 ліпеня яны сустрэнуцца пад Грунвальдам, каб сысціся ў рашаючай бітве.



**1886 год** — нямецкі інжынер і вынаходнік Карл Бенц зрабіў першую паездку на сваім аўтамабілі, развіўшы хуткасць 16 км/г. Цікава, што менавіта ў гэты дзень, але праз 50 гадоў (1936) пасля з'яўлення першага аўтамабіля, у СССР была ўтворана Дзяржаўная аўтамабільная інспекцыя (ДАІ).

Цытата дня

*«Прымаць парады ворагаў — памылка, але выслухаць іх трэба, каб паступіць наадварот. Гэта і будуць па-сапраўднаму правільныя дзеянні».*

**Саадзі (1204—1292), персідскі паэт, філосаф.**


## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА БЕЗ УСЛОВИЙ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ОБРАЩЕННОГО В ДОХОД ГОСУДАРСТВА

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | - ангар, расположенный по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. В. Гастинец, 67, инв. № 16-00091 общей площадью 394,4 кв. м, год постройки – 1979, фундамент кирпичный, стены металлические, крыша металлическая, полы бетонные.<br>Начальная цена – 109 512 000 рублей.<br>- трехкомнатная квартира, расположенная по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Томилина, 30-2, стены кирпичные, изнутри оштукатуренные; перегородки гипсовые, оштукатуренные; полы – линолеум; двери – филенчатые общей площадью 64,8 кв. м, площадь жилых комнат 44,6 м. кв., площадь подсобных помещений 20,2 м.кв., год постройки – 1974.<br>Начальная цена – 89 586 000 рублей.<br>- одноэтажное кирпичное здание (комплекс состоит из столярного цеха, лесопильного цеха, бытового помещения, кран-балки), расположенное по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Элеваторная, 5 общей площадью 851,1 кв. м, год постройки – 1976.<br>Начальная цена – 207 846 000 рублей.<br>- бокс гаражный, кирпичный, расположенный по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Элеваторная, 5 общей площадью 92,8 кв. м, год постройки – 1978.<br>Начальная цена – 23 976 000 рублей |
| **Продавец** | Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Молодечненском райисполкоме |
| **Организатор аукциона** | СИКУП «УКС-СЕРВИС» |
| **Сумма задатка** | - ангар – 10 951 200 (Десять миллионов девятьсот пятьдесят одна тысяча двести) рублей на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС»;<br>- квартира – 8 958 600 (Восемь миллионов девятьсот пятьдесят восемь тысяч шестьсот) рублей на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС»;<br>- одноэтажное кирпичное здание – 20 784 600 (Двадцать миллионов семьсот восемьдесят четыре тысячи шестьсот) рублей на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС»<br>- бокс гаражный, кирпичный – 2 397 600 (Два миллиона триста девяноста семь тысяч шестьсот) рублей на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС» |
| **Порядок оплаты** | Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 2 месяцев и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-СЕРВИС» |
| **Документы, представляемые для участия в аукционе** | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, заверенные нотариально, доверенность, выданная представителю юридического лица; физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, справку ГНИ об отсутствии задолженности по подоходному налогу |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | 19.07.2010 г., до 16.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел. (8 0176) 75 16 09, 75 19 20 (факс) |
| **Дата, время и место аукциона** | 20.07.2010 г. в 15.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, СИКУП «УКС-СЕРВИС» |

УНН 600182305


36,6°

# НАШЫ ЛЮБІМЫЯ СЕМКІ: ШКОДА АБО КАРЫСЦЬ?

**КАЛІ папрасіць каго-небудзь назваць любімую ежу, то ў спіс пералічанага абавязкова ўвойдуць семачкі сланечніку. Многія так любяць іх грызці, што цяжка знайсці чалавека, які хоць раз у сваім жыцці не купляў бы сабе пакуначак смажаных семак. І хоць гэты ласунак часта прыводзіць да гастрыту, язвы страўніка і нават да апендыцыта, народ усё роўна не прымусіш адмовіцца ад гэтага ласунку. Тым не менш неабходна ведаць пра шкоду гэтага насення (між іншым, кашмарным сне стаматолагаў), бо грызці іх мы ўсё роўна не перастанем, але трэба разумець, у якой колькасці гэта можна рабіць.**

**Мусіць, часцей за ўсё сярод урачоў пацыенты хлусяць стаматолагам. Ну як прызнаешся чалавеку ў масцы і са свердлам у руках, што прычынай той або іншай пломбы сталі ўчорашнія семачкі? Ды ніколі! Бо ўсе дантысты наперабой пераконваюць нас не грызці семачкі. Але ж утрымацца немагчыма, а значыць, праблем з зубамі не пазбегнуць. Тым не менш давайце пашукаем і плюсы ва ўсеагульнай любові да чорных зярнятак.**

### КАРЫСЦЬ

1. Гэты прадукт багаты раслiннымі тлушчамі і тлушчарастваральнымі вітамінамі — A, D і E. Поліненасычаныя тлустыя кіслоты, якія змяшчаюцца ў раслінным алеі, спрыяюць паніжэнню ўзроўню халестэрыну ў крыві і запавольваюць працэсы старэння.

2. У белым ядры семак больш за 25 % паўнавартаснага харчовага бялку, каля 35 % тлушчу і шмат вугляводаў. Акрамя таго, насенне сланечніку багатае вітамінамі, якія ўмацоўваюць скуру і слізістыя абалонкі чалавечага арганізма, нармалізуюць кіслотна-шчолачны баланс.

3. Маленькія белыя зярняткі — скарбніца мікраэлементаў: цынк, фтор, ёд, кальцый, жалеза. І гэтыя багацці семачкі захоўваюць на працягу ўсёй зімы, за што і атрымалі назву «прыродных кансерваў».

4. Семкі з'яўляюцца сродкам прафілактыкі атэрасклерозу, інфаркту міякарда і іншых захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы, а таксама дапамагаюць пры захворваннях печані і жоўцевыводных шляхоў. Бялок семак утрымлівае незаменныя амінакіслоты.

5. Больш карысныя семкі ў шкарлупіне, чым без яе. У лузаных семечках тлушчы акісляюцца.

6. Семечкі сланечніку па ўтрыманні ў сабе карысных рэчываў вельмі падобныя на ўсе астатнія віды. Але ў той жа час і адрозніваюцца тым, што ўтрымліваюць фоліевую кіслату і вітамін $B_6$.

7. Дзякуючы ўтрыманню спецыфічнага для гэтага насення вітаміну яны добра спрыяюць умацаванню як валасоў, так і пазногцяў. Да таго ж усё больш і больш семкі выкарыстоўваюць у касметалогіі. Так, скрабы для цела, створаныя на аснове семак, дапамагаюць выдаліць змярцвелыя клеткі і аднавіць структуру скуры, ствараючы эфект «абноўленай».

8. Псіхолагі сцвярджаюць, што семкі, а дакладней, працэс іх лузання, вельмі карысны для заспакаення нерваў: калі хвалюешся, знаходзішся ў стрэсе і г.д., то трэба, каб рукі былі чымсьці занятыя, таму семкі дапамагаюць расслабіцца і адцягнуць увагу — як ружанец у мусульман.

9. У 100 грамах семак утрымліваецца больш за 300 міліграмаў магнію — у шэсць разоў больш, чым у жытнім хлебе, які лічыцца адным з асноўных пастаўшчыкоў гэтага элемента.

### ШКОДА:

1. Семкі не варта ўжываць тым, хто хоча пахудзець. У 100 г сланечнікавых семечак утрымліваецца цэлых 520 ккал. А гэта значыць:

паўшклянкі семак = 2 порцыі варанага рысу або плітка шакаладу;

1 шклянка = паўбохана хлеба або порцыя шашлыку са свініны.

2. Пры смажанні вялікая частка карысных рэчываў, якія змяшчаюцца ў семках, разбураецца.

3. Доўгія карані сланечніку ўбіраюць у сябе з глебы ўсё, што можна і што нельга. Часцей за ўсё сярод непрыемных дадаткаў выяўляецца кадмій, шкоднае ўздзеянне якога на арганізм чалавека даўно даказана. Ён значна павялічвае рызыку ўзнікнення захворванняў нырак і нервовай сістэмы. І паколькі кантролю за выпускам і продажам семак няма практычна ніякага, то яны могуць нанесці арганізму сур'ёзную шкоду, калі ўжываць семкі невядомага паходжання. Гарантыі таго, што вы не нагрызяце ў свой арганізм досыць вялікую дозу кадмію, таксама ніхто даць не можа.

4. Пасля доўгага лузання семак зубная эмаль разбураецца, з-за чаго нават у маладосці зубы ў чалавека крышацца, становяцца брыдкімі, і часта на іх утвараюцца чорныя плямкі — зубныя камяні.

5. Семкі адмоўна адбіваюцца на галасавых звязках. Іх непажадана ўжываць спевакам, бо пасля іх ужывання горла як быццам змазваецца і спяваць высока артыстам немагчыма. Пра гэта расказваюць яшчэ ў музычных школах.



**Гэта цікава:**

**...у мусульман прыкмета самага кепскага тону і непавагі да суразмоўцы — звычка жаваць жуйку, лузаць семкі падчас гутаркі.**

**...ва Уладзівастоку ў 2002-м годзе афіцыйна забаранілі прадаваць семкі ў сувязі з візітам у горад прэзідэнта РФ — У.У. Пуціна.**

**...Прападобная Феактыста 35 гадоў жыла на востраве Паросе ў адзіноце і малітве. Яе ежай былі толькі семкі.**

## ЯК «СПРАШЧАЛІ» ПРАЦЭДУРУ РАЗЛІКАЎ

**Упраўленнем КДБ па Гродзенскай вобласці расследуецца крымінальная справа ў дачыненні да службовай асобы адной з будаўнічых арганізацый абласнога цэнтра па ч. 3 арт. 210 Крымінальнага кодэкса Беларусі («крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, учынены ў асабліва буйным памеры»).**

Будаўнічая фірма ажыццяўляла рамонт уваходнай аркі са званіцай слонімскага касцёла Бязгрэшнага Зачацця Прасвятой Дзевы Марыі. Прычым настаяцелю храма службовыя асобы прадпрыемства прапанавалі разлічвацца за выкананую працу як безнаяўным шляхам, так і наяўнымі грашыма, матывуючы гэта спрашчэннем працэдуры разлікаў і эканоміяй часу. А ў выніку... Устаноўлена, што за перыяд з красавіка мінулага па студзень гэтага года свяшчэннаслужыцелі перадалі прарабу камерцыйнай структуры больш за 23 мільёны рублёў. Аднак у бухгалтарскіх дакументах фірмы гэтыя сродкі не адлюстроўваліся, паколькі грошы на прадпрыемства не паступалі, а краліся, паведамляе прэс-служба УКДБ па Гродзенскай вобласці.

У рамках крымінальнай справы следчым трэба вызначыць поўнае кола асобаў, маючых дачыненне да крадзяжу грашовых сродкаў прыходу Гродзенскай рымска-каталіцкай епархіі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**


14 июля 2010 года в 16.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Минскэнергострой».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О приобретении акций на баланс Общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39.

Начало регистрации — 11.00.

УНП 100008291


777

# СТАРЫЯ РЭЧЫ ПЕРАШКАДЖАЮЦЬ ЖАНЧЫНЕ ПАЗБАВІЦЦА АД ЛІШНІХ КІЛАГРАМАЎ

**УСЁ, што знаходзіцца ў доме, так ці інакш звязана з нашай падсвядомасцю, жаданнямі і будучыняй. Трэба памятаць, што далёка не кожная рэч можа прынесці гаспадару карысць. Для захавання здаровай касмічнай экалогіі варта перыядычна праводзіць глабальную інвентарызацыю і без шкадавання пазбаўляцца ад усяго, што «забруджвае» энергетыку дома. А гэта можа быць:**



### ... стары абутак і вопратка

Мілыя сэрцу тапкі «працуюць» у плюс толькі ў цэлым выглядзе. Як толькі абутак парваўся ці знасіўся — ад яго трэба пазбаўляцца. Тое ж тычыцца вопраткі. Не варта ператвараць дом у склад старых паношаных рэчаў. Усе яны прыцягваюць негатыўную энергію і нават перашкаджаюць пераменам. Адэпты фэн-шую лічаць, што старыя рэчы перашкаджаюць жанчыне пазбавіцца ад лішніх кілаграмаў, прыўносяць у жыццё мітусню і занепакоенасць. Выкідаць усё без разбору, зразумела, не трэба, а вось правесці «чыстку» шафаў ніколі не позна.

### ...біты посуд

Такі ў нас менталітэт: выкідваць стары посуд шкада, карыстацца новым, дарагім — тым больш шкада. Мы ставім прыгожы дарагі посуд на паліцы ці ў сервант, а старым, бітым карыстаемся штодня. І потым здзіўляемся: чаму ў нас праблемы са здароўем, у асабістым жыцці і г.д. Трэшчыны на посудзе даюць трэшчыны і ў лёсе. І гэта нават не містыка. Талеркі сімвалізуюць сабой сям'ю, утульнасць, дабрабыт. І калі посуд патрэскаўся, мы падсвядома настройваем сябе на няўдачы. Не трэба шкадаваць сервізы і дарагія наборы. Жывём мы адзін раз, а добрага посуду на ўсіх хопіць.

### ...расліны, якія ўюцца

Зялёныя гадаванцы ў доме — гэта выдатна. Толькі не тыя, што ўюцца. Такія расліны «прыцягваюць» у хату розныя хваробы. А вось калі расліна знаходзіцца з вонкавага баку дома — яна абараняе вас ад сурокаў і непрыемнасцяў. Лепш вынесці вашых зялёных «уюноў» за межы дома — хай стаяць на варце вашага спакою, а не плодзяць хваробы.

### ...сухі чарот і кавыль

Многія гаспадыні любяць упрыгожваць хату каляровым чаротам і кавылём. А вось нашы продкі лічылі, што гэтыя расліны ў доме могуць прынесці няшчасце. Існуе шмат іншых траў, якімі можна ўпрыгожыць і араматызаваць пакой. Засушаныя кветкі паляпшаюць энергетыку, пазбаўляюць ад хваробаў, дораць добры настрой. Замяніце чарот на бегонію, а хвойныя галінкі прыносьце ў дом толькі на час зімовых святаў — і тады вы ніколі не будзеце мець недахопу ў станоўчай энергіі.

Спецыялісты раяць: калі сумняваецеся ў станоўчай энергетыцы рэчы — паспрабуйце з ёй пагутарыць, падзяліцца сваімі праблемамі і радасцямі. Калі вам пры гэтым няёмка і няўтульна — значыць, рэч чужая, не ваша. Калі ж пасля такой размовы вы сталі адчуваць сябе лепш, значыць, рэч зарадзілася вашай энергетыкай і зможа абараніць ваш дом ад негатыву.

**Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.**

